Нямецкая меншасць ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Парцава ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 41 (2839) Год LV | Беласток, 10 кастрычніка 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

„ЗНІЧКА” — СВЕЦІЦЬ 15 ГАДОЎ

Вядомы публіцы на Беласточчыне і з канцэртаў у Варшаве, Гданьску, Пунску, у Рэспубліцы Беларусь і Германіі вакальны калектыў „Знічка” дачакаўся 15-гадовага юбілею. Першы раз дзяўчаты са школьнага калектыву пры Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы выступілі ў кастрычніку 1995 года, на Дзень настаўніка. Набор у гурт і рэпетыцыі распачаліся яшчэ ў верасні і за кароткі перыяд белліцэісткі паспелі развучыць першыя беларускія песні. Пазней у рэпертуары калектыву паяўляліся новыя творы, напрыклад, апрацаваныя фальклорныя песні і сучасныя эстрадныя беларускія шлягеры. Па-за паасобнымі польскімі творамі, перш за ўсё з рэпертуару салістак, „Знічка” заўсёды выступае па-беларуску.

— Мы выхаваліся ў беларускай традыцыі і рады, што можам спяваць па-беларуску, — заяўляе салістка „Знічкі” Дар’я Маркевіч.

— У нашай школе вывучаем беларускую мову і таму наш калектыў павінен спяваць на роднай мове і быць візітнай картачкай школы, — кажа Каміля Чурак.

— На пачатку дзейнасці калектыву падбірала я рэпертуар, які быў мне даступны, напрыклад, са спеўнікаў. Магчымасці акампанементу тады таксама былі абмежаваныя і мы карысталіся толькі „арганкамі”, — гаворыць мастацкі кіраўнік „Знічкі” і заадно настаўніца музыкі Бажэна Ляўчук, якая на працягу пятнаццаці гадоў кіруе дзейнасцю калектыву. Закончыўшы эстраднае аддзяленне Універсітэта культуры ў Мінску (раней вучылася ў Бельскім белліцэі) спадарыня Бажэна адразу прыйшла на працу ў Гайнаўскі белліцэй і з верасня 1995 года стала арганізаваць вакальны калектыў. Першы пазашкольны выступ „Знічкі” адбыўся ў пачатку 1996 года на фестывалі „Беларуская песня” і там на цэнтральным узроўні гайнаўскі калектыў адразу заняў другое месца. З гэтага часу „Знічка” заўсёды была лаўрэатам гэтага ж фестывалю. Напрыклад, у 1998 г. гайнаўскія белліцэісткі атрымалі кубак прэм’ера Владзімежа Цімашэвіча, а таксама ўзнагароду Радыё Беласток — магчымасць запісаць аўдыёкасету ў студыі „Рэмбрандт”. „Знічка” выкарыстала шанц і выпусціла сваю першую касету „Шчаслівы вальсок”. Да 1998 года калектыў дзейнічаў безыменна, пакуль наша журналістка Ада Чачуга ў сваім артыкуле назвала калектыў „Знічкай”, карыстаючыся загалоўкам песні, якую гэты гурт выконваў. Гэтая назва настолькі спадабалася вучаніцам і іх кіраўніку Бажэне Ляўчук, што гурт карыстаецца ёй па сённяшні дзень. У кастрычніку 1999 года дзявочы калектыў выступіў на фестывалі „Бардаўская восень” у Бельску-Падляшскім, а ў 2001 г. у рамках Конкурсу малых грантаў, аб’яўленага Цэнтрам грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь, „Знічка” атрымала сродкі і выдала ў наступным годзе кампакт-дыск эстрадных песень „Новае”.

— Толькі пасля дзяўчаты адчулі большую патрэбу выступаць з апрацаваным фальклорам. Першай такія песні пачала спяваць Ілона Карпюк, а пасля Магда Чыквін, Амелія Горбач і Аня Петручук. Апрацаваныя фальклорныя песні змешчаны на чарговым нашым дыску „Пульс хвіліны”, якога выданне было прафінансаванае сродкамі МУСіА. Ёсць там таксама польскія песні, з якімі выступалі некаторыя нашыя салісткі на польскіх конкурсах, — расказвае Бажэна Ляўчук.

Перамогі на фестывалях і конкурсах дабіваліся таксама салісткі „Знічкі” — Беата Брэнька, Іаанна Масайла, Ілона Карпюк, Іаанна Врублеўская, Марта Грэдаль, Маргарыта Карпюк, Амелія Горбач, Магда Чыквін, Дар’я Маркевіч і Рэната Тушынская.

— Я спачатку спявала ў арэшкаўскіх „Незабудках” і ўжо тады хацела спяваць у славутым калектыве „Знічка”. Я люблю спяваць па-беларуску і ахвотна выступаю сола з лірычнымі творамі, выконваючы якія маю магчымасць перадаць публіцы свае пачуцці. Падабаюцца мне таксама эстрадныя творы, якія спяваю з калектывам, — кажа белліцэістка Дар’я Маркевіч.

— Нашы салісткі найчасцей самі падбіралі сабе рэпертуар, а я толькі ім дапамагала ў гэтым, — гаворыць спадарыня Бажэна.

Калектыў „Знічка” часта выступаў на школьных і гарадскіх мерапрыемствах у Гайнаўцы, перамагаў на Гайнаўскіх сустрэчах з праваслаўнай калядкай і вылучаўся прыгожым спевам на Павятовых аглядах калядоўшчыкаў, ладжаных на Гайнаўшчыне.

— Праваслаўнае выдавецтва „Братчык” мае выдаць кампакт-дыск з калядкамі, якія мы ўжо запісалі, — паведамляе апякун Бажэна Ляўчук.

Выступы дзяўчат з белліцэя на Фестывалі нацыянальных меншасцей у Гданьску, у час Агляду нацыянальных і этнічных меншасцей „Супольнасць у культуры” ў Варшаве і падчас Сустрэч нацыянальных меншасцей у Пунску рабілі вельмі станоўчае ўражанне на публіцы сабранай у час гэтых мерапрыемстваў. „Знічка” ўдала выступала ў мінулым у Германіі і Беларусі — у Гродне, Пружанах і Свіслачы, а таксама ў Магільне каля Познані. Аднак, зразумела, калектыў белліцэістак найбольш выступаў на разнародных мерапрыемствах на Беласточчыне, найчасцей на беларускіх фэстах і іншых святкаваннях. Удзельніцы „Знічкі” рады выступам і супольным выездам па-за Гайнаўку. Заяўляюць, што дзякуючы „Знічцы” маюць магчымасць пазнаёміцца з іншымі аматарамі спявання і пабываць у цікавых месцах.

— Займаючыся ў калектыве, мы разгортваем свае ўмеласці, — гаворыць Марлена Бяглюк.

А Дамініка Лешчук кажа, што з песняй жыве ад пятага класа падставовай школы і любоў да спявання прывяла яе ў „Знічку”. У падобны спосаб трапіла ў калектыў Маргарыта Гаворка.

— Амаль кожны год я дабіраю дзяўчат у „Знічку” і таму ўсе здольныя вучаніцы маюць магчымасць выступаць з намі. Аднак такі набор мае і адмоўны бок. Праз месяцаў два, з пачатку школьнага года, новыя члены калектыву вымушаны сур’ёзна папрацаваць, каб развучыць стары рэпертуар і якраз рэпетыцыі ў гэты пачатковы перыяд менш цікавыя для пастаянных членаў калектыву. Неспры-

працяг ☞2

Апякун Бажэна Ляўчук

Асаблівасці характару

Дзіву даешся з беларускага нацыянальнага характару. У краіне жорсткі рэжым, якога нібыта трэба баяцца як агню, а тут ажно дзевятнаццаць чалавек заявілі свае намеры заняць месца Аляксандра Лукашэнкі. Нібыта нічога не баяцца — ні вайны, ні Лукашэнкі. Заявіць то заявілі, толькі не ўсё сапраўды на гэтае месца прэтэндуюць па-сур'ёзнаму. І гэта яшчэ адна загадка беларускага характару. Мяркуйце самі — адзін, дагэтуль невядомы ў палітычных колах беспрацоўны Ілья Дабратвор вырашыў зарэгістраваць сваю ініцыятыўную групу з аднаго чалавека для збору ста тысяч подпісаў. З самога сябе. І сябе ж прызначыў кіраўніком гэтай групы. Крыху больш у сваю ініцыятыўную групу запісала беспартыйная Наталля Старыкава. Ажно трыццаць чалавек. І нават знайшла кіраўніка гэтай групы. Іх, зразумела, не зарэгістравалі. Але выбарам гэта надало крыху адцення блазенства. Хіба што камусьці трэба, каб выбары ператвараліся ў фарс не толькі па сутнасці, але каб і знешне так выглядалі.

Некаму спатрэбілася, відаць, і вялікая колькасць кандыдатаў. Хіба што ўладзе. І народ, як у старыя савецкія часы, адразу адгукнуўся. Неверагодную актыўнасць праявілі амаль усе колы грамадства. Прадпрымальнікаў прадставілі ажно два прэтэндэнты: Віктар Цярэшчанка і Уладзімір Правальскі. Дзяржаўных служачых ды гаспадарнікаў — і Іван Кулікоў, і Сяргей Рыжоў, і Дзмітры Ус. Не засталіся ўбаку і людзі сталага веку. Свой намер стаць прэзідэнтам выказаў пенсіянер Пётр Барысаў. Ёсць у спісе і беспрацоўны — Сяргей Іваноў. Адны толькі калгаснікі не вылучылі свайго кандыдата. Напэўна не было калі. Спачатку бітва ў іх была за ўраджай, а пасля разам з дзеючым прэзідэнтам святкавалі „дажынкі".

Як казаў Воланд, герой адной з кніг Булгакава, кампанія рознакаляровая і няхітрая. І нікому невядомая. Тут, як кажуць у народзе, усё шыта белымі ніткамі. Ну якія прадпрымальнікі рызыкнулі б сваім бізнесам, калі б не мелі нейкіх гарантый або загадаў? Што ўжо казаць пра дзяржаўных служачых. Але, як сцвярджае яшчэ адна народная мудрасць — у мутнай вадзе і рыбку лягчэй лавіць. Вось ваду і муцяць.

Тое, што ўлада будзе рабіць блытаніну — не навіна. Пра гэта вядома даўно. А вось чаму апазіцыянеры скочылі ў гэтую ваду амаль што не цэлым складам, тут лагічна не прааналізуеш. Тут можна ўсё спісаць толькі на асаблівасці нашай натуры. Хіба яны вырашылі прадставіць увесь спектр палітычнага бамонду — ад зялёных, да беспартыйных. Тут і Уладзімір Някляеў, і Андрэй Саннікаў, і Яраслаў Раманчук, і Юры Глушакоў, і Мікола Статкевіч, і Рыгор Кастусёў, і Віталь Рымашэўскі. І ўсе ўпэўненыя ў сваёй перамозе.

У адрозненні ад першага спісу, людзі тут усе вядомыя, у палітыцы не навічкі. Адзін другога ведаюць даўно. Толькі дамовіцца паміж сабой аніяк не могуць. А вось іх ініцыятыўныя групы — могуць. Нярэдка ўсплываюць такія факты, што адзін і той жа зборшчык подпісаў запісаны ў тры, а то і чатыры ініцыятыўныя групы. Напэўна, каб сваім прыкладам паказаць нацыянальным лідарам як трэба дамаўляцца і аб'ядноўвацца. І гэта таксама дзівосная асаблівасць беларускага нацыянальнага характару. Пакуль людзі працуюць, датуль сябруюць. Як толькі выбіваюцца ў лідары, пачынаюць губляць гэтую здольнасць.

Ёсць у спісе прэтэндэнтаў на першае дзяржаўнае месца яшчэ два вядомыя чалавекі. Адзін вядомы не толькі ў нас, на Беларусі, але і ва ўсім свеце. Дзякуючы яму, геаграфічнае становішча нашай краіны ведаюць нават папуасы, якія хоць крыху ўмеюць чытаць і маюць доступ да газет. Гэта існы начальнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама сцвярджае, што ў сваёй перамозе перакананы.

І яшчэ адзін палітык так кажа. Гэта Сяргей Гайдукевіч. На гэты раз ён нават адважыўся сабраць ініцыятыўную групу большую чым у Лукашэнкі. І гэта стала прычынай чутак, якія маланкава сталі разносіцца ў народзе. Ці не ён гэта той чорны конік, на якога паставіць пакрыўджаная на Аляксандра Рыгоравіча Расія?!

Зрэшты, чуткі на Беларусі гэта адзіная свабодная прэса. Таму інфармаванне праз іх з'яўляецца яшчэ адной рысай нашага непаўторнага нацыянальнага характару.

Віктар САЗОНАЎ

10 гадоў Kamunikatu

29 верасня ў Мінску ў прэстыжнай галерэі „Ў" Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org адзначыла 10-я ўгодкі з часу стварэння. Імпрэза была падрыхтавана сіламі супрацоўнікаў сайта і прадстаўнікоў Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына", якое досыць цесна супрацоўнічае з інтэрнэт-бібліятэкай. У госці да мінчукоў прыехалі з Беластока ініцыятар стварэння папулярнага сёння сайта Яраслаў Іванюк, а таксама бібліятэкарка і журналістка Наталля Герасімюк. Абое вядомыя таксама як сталыя супрацоўнікі Радыё Рацыя. Цягам вечарыны адбылася прамоцыя інтэрнэт-бібліятэкі і радыё, прысутным раздаваліся кашулькі РР і іншая сувенірна-рэкламная прадукцыя.

Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org з'яўляецца праектам Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку. Яна паўстала ў 2000 годзе як прыватная ініцыятыва і цягам некалькіх гадоў існавала на грамадскіх пачатках. З часам сціплы збор публікацый беларусаў Беласточчыны, дзякуючы фінансавай падтрымцы польскага МЗС у рамках праекта „Польская дапамога", перарос у даволі буйную бібліятэку, якая сёння стала бадай найбольш папулярнай беларускай бібліятэкай у сеціве. На сённяшні дзень на старонках сайта Kamunikat.org. можна знайсці амаль 6 тысяч розных беларускіх публікацый — кніг, часопісаў, газет, mp3-файлаў, якія датычаць Беларусі ці беларусаў. Багатыя зборы гістарычнай літаратуры, выданняў, якія недаступныя ў традыцыйных бібліятэках Беларусі, робяць Kamunikat.org крыніцай унікальнай інфармацыі. Важна, што ў рамках праекта „Беларускія аўтары" Kamunikat.org дае магчымасць ствараць персанальныя сайты беларускіх пісьменнікаў, публіцыстаў і даследчыкаў, чые кнігі знаходзяцца ў рэсурсах бібліятэкі. Невыпадкова імпрэза сабрала багата вядомых творцаў — на вечарыне прысутнічалі Уладзімір Арлоў, Міхась Скобла, Юрась Пацюпа, Мікола Касцюкевіч, іншыя паэты. Прыйшлі таксама вядомыя людзі — амбасадар Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан, галоўны рэдактар газеты „Новы час" Аляксей Кароль, былы генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхал Аляксейчык, былы консул РБ у Гданьску Анатоль Бутэвіч, навуковец і палітык Анатоль Астапенка, даследчык беларускай рок-музыкі Вітаўт Мартыненка, сталічныя журналісты і бібліяфілы. Вялікую цікавасць у сабраных выклікала выстава-кірмаш кніг, выдадзеных на Беласточчыне, у тым ліку літаратурным аб'яднаннем „Белавежа", Беларускім гістарычным таварыствам, Звязам беларускай моладзі, Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва". Гэтыя выданні — важкі ўнёсак у справу беларускамоўнага друку, які яшчэ належыць ацаніць па-сапраўднаму ў будучыні.

Вечарыну адкрыла Ніна Шыдлоўская, старшыня рады ЗБС „Бацькаўшчына". Канешне ж выступілі стваральнік і каардынатар праекта Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org, праграмны дырэктар Радыё Рацыя Яраслаў Іванюк і стваральніца беларускай бібліятэкі пры Музеі беларускай культуры ў Гайнаўцы Наталля Герасімюк. Яны грунтоўна распавялі пра сваю працу і прынцыпы дзейнасці, а таксама новыя магчымасці, што стварае інтэрнэт-бібліятэка.

Слова на вечарыне мелі навукоўца Наталля Гардзіенка, пісьменнік Уладзімір Арлоў, кіраўнік праваабарончага цэнтра „Вясна" Алесь Бяляцкі, які падарыў бібліятэцы два важкія тамы выдання „Вялікае Княства Літоўскае". Завяршылася імпрэза выдатным канцэртам мэтра беларускай бардаўскай песні Алеся Камоцкага. Вельмі важна, што прэзентацыя сабрала каля сотні чалавек, сярод якіх пераважала моладзь.

Ладзік МАЙНІЧ

1 ☞ працяг

15 ГАДОЎ „ЗНІЧКІ"

яльная для нашага калектыву была таксама школьная рэформа, пасля якой чатырохгадовыя ліцэі былі заменены на трохгадовыя і зараз я ў асноўным працую з ліцэісткамі два гады, бо ў трэцім класе яны ўжо рыхтуюцца да матуральных экзаменаў, — тлумачыць Бажэна Ляўчук.

Зараз у „Знічцы" займаецца 12 дзяўчат, хаця яе састаў можа быць яшчэ пабольшаны.

— Праца з моладдзю нялёгкая, але дае мне радасць. Я стараюся не адпіхваць, толькі прыцягваць маладых дзяўчат у калектыў і намагаюся, каб у час рэпетыцый і выездаў ствараць у гурце мілую атмасферу. У мяне прыяцельскія суадносіны з дзяўчатамі, бо я ў такі спосаб вяду музычныя заняткі, — гаворыць спадарыня Бажэна.

— У нас добра складваецца супрацоўніцтва з нашым апекуном, паняй Бажэнай Ляўчук, якая ўмее добра рыхтаваць нас да выступаў, — гаворыць Каміля Чурак.

Праўда, дзяўчаты са „Знічкі" вельмі часта ставаніліся пераможцамі фестывалю „Беларуская песня".

— Гэты фестываль нам па душы. Апошнім часам мы заўсёды займалі на ім першыя месцы і гэта заахвочвала дзяўчат да далейшай плённай працы. Выступілі мы адзін раз на „Бардаўскай восені", але гэтае мерапрыемства, так як і „Басовішча", не для нашага калектыву, бо мы выступаем найчасцей з эстраднай беларускай песняй, — кажа Бажэна Ляўчук. — Шкада, аднак, што фестываль „Беларуская песня" адбываецца якраз у час зімовых канікул і калі б не любоў нашых дзяўчат да спявання, цяжка было б іх ангажаваць у вольныя дні на частыя рэпетыцыі перад конкурснымі выступамі.

— Нам найбольш падабаецца сучасны рэпертуар, а ў ім арыгінальныя нестандартныя песні, — заяўляюць, як іх называе Бажэна Ляўчук, зоркі калектыву: Дар'я Маркевіч, Марта Адамюк і Рэната Тушынская. Гэтыя дзяўчаты кажуць, што ў сваім далейшым жыцці таксама хацелі б спяваць, можа ў нейкім калектыве ў час навукі ў вышэйшых установах. Зараз белліцэісткі пад наглядам Бажэны Ляўчук рыхтуюцца да ўрачыстага канцэрта „Знічкі", прымеркаванага да 15-годдзя калектыву, які мае быць наладжаны 19 лістапада ў Гайнаўскім доме культуры. Жадаем „Знічцы" і яе апекуну Бажэне Ляўчук далейшай паспяховай дзейнасці.

Ілона КАРПЮК

Добры прыклад ідзе... знізу

А дакладна з поўдня. На Апольшчыне, дзякуючы паспяховай падрыхтоўцы да самаўрадавых выбараў ды кансалідацыі ў час перапісу насельніцтва, нямецкая меншасць можа сама рашаць свае справы, м.ін. уводзіць дапаможную мову ды дадатковыя ўказальнікі на роднай мове. Там не толькі немцы выбіраюць немцаў, але часта на немцаў галасуюць палякі. Па словах Бернарда Гайды, старшыні Саюза нямецкіх грамадска-культурных таварыстваў у Польшчы, таямніца поспеху заключаецца ў высокай грамадскай самаарганізаванасці ды ў разважным, разумным кіраванні на кожным узроўні.

Фота з архіва Рафала Бартэка

Рафал Бартэк (першы злева) — старшыня Рады Гміны Хшанставіцы (Chrząstowice / Chronstau)

Месцы сустрэч

Мала хто помніць, што ў час парламенцкіх выбараў 1991 года Беларускі выбарчы камітэт і Камітэт „Нямецкая меншасць" прыйшлі да пагаднення. Аднак у выніку выбараў немцы атрымалі 7 мандатаў у Сейм, мы — ніводнага. Варта пашукаць прычыны паражэння або пакарыстацца добрым вопытам, бо якраз немцы з Апольскага ваяводства свае выбарчыя стандарты будуюць з 1990 года, калі адбыліся першыя, свабодныя самаўрадавыя выбары.

— На гэты момант на 71 гмін у нас 23 сваіх войтаў, на 12 старастваў у ваяводстве 5 сваіх старастаў ды 7 сваіх радных з ліку 30 дэпутатаў, якія засядаюць у ваяводскім сейміку, — пералічвае Рафал Бартэк, старшыня Рады гміны Хшанставіцы (Chrząstowice / Chronstau).

— Польскае заканадаўства дазваляе ствараць спісы кандыдатаў меншасным аб'яднанням ды ствараць самастойныя выбарчыя камітэты, — працягвае Бернард Гайда. — У нас зарэгістраванае Грамадска-культурнае таварыства немцаў на Шлёнску-Апольскім, якое мае магчымасць працаваць на выбарчы вынік і можа афіцыйна рэгістраваць выбарчы камітэт, але сутнасць нашай працы гэта дзейнасць з самага нізу. Ладзім гэтак званыя **выбарчыя канвенцыі** на ўсіх узроўнях — у гмінах, паветах ды на ўзроўні ваяводства, каб лакальныя дзеячы маглі выбраць сваіх кандыдатаў на спісы нашага камітэта. Тэхнічна маем яшчэ адзін козыр. Апрача аднаго зарэгістраванага Таварыства ў сапраўднасці дзейнічаем на аснове **320 гурткоў** і практычна гэта яны вядуць выбарчыя кампаніі на сваіх узроўнях (у гмінах ці паветах).

Deutsche Freundschaftskreis, DFK, гэтак званыя „месцы сустрэч". Абазначаюць канкрэтны будынак, дошку з назвай, часта з лунаючым сцягам — нямецкім ці рэгіянальным. Сустрэчы адбываюцца па магчымасці даволі рэгулярна, раз у тыдзень ці ў два тыдні. У Апольскім ваяводстве жыве каля мільёна чалавек, тады DFK гэта не толькі гарады, але і вёскі. Месцы сустрэч бываюць у лакальнай святліцы, якая выконвае розныя функцыі, або ў дэпо ў пажарнікаў ці ў нейкім доме культуры. DFK — **аснова выбарчай кампаніі**. Не толькі арганізуюцца там бясплатна выбарчыя сустрэчы, але дзеячы гурткоў на грамадскіх пачатках вешаюць плакаты ці выконваюць іншыя неабходныя працы.

— Бачна, што людзі менш ахвотна галасуюць на нямецкіх паслоў на парламенцкіх выбарах, чым яшчэ ў 1990-х гадах, — расказвае Бернард Гайда. — Затое на самаўрадавых выбарах утрымліваем першапачатковае становішча, калі нашы радныя выбіраліся на хвалі ўсеагульнай эйфарыі 1990-х гадоў. На нашай тэрыторыі паяўляюцца спісы кандыдатаў Грамадзянскай платформы ці ПіС, але яны заўважныя раз на чатыры гады, а нямецкая меншасць пражывае тут увесь час. Калі ў ГП каля 40 тысяч членаў ў цэлай Польшчы, то ў нас каля **50 тысяч** у адным ваяводстве, тых, якія аплачваюць складчыны, не гавару пра прыхільнікаў.

Выбарчы камітэт „Нямецкая меншасць"

— Няма карупцыйных афёр і няма, што зараз у Польшчы з'яўляецца сумнай нормай, правакаванай **палітычнай нязгоды**, — разважае старшыня Саюза нямецкіх грамадска-культурных таварыстваў у Польшчы. — Нашы гміны вядуць спакойнае жыццё, карыстаюцца еўрапейскімі сродкамі і развіваюцца. На мой погляд варта, каб на меншасных кандыдатаў галасавалі не толькі меншасці, але і палякі, бо меншасць у прынцыпе ў такой сітуацыі, што **дбае пра згоду** і ў нас гэта пацвярджаецца. У сітуацыі канфліктаў яна прыгаворана на паразу, бо не мае шанцаў выйграць з большасцю. Гэта абумоўлівае характар лакальнай улады.

Фота з архіва Рафала Бартэка

Бернард Гайда дваццаць гадоў заангажаваны ў выбарчы працэс сярод нямецкай меншасці. Таямніцу выбарчых вынікаў прыводзіць у парадак такім чынам:

— Поспех перш за ўсё ў тым, што **не прапануем** у выбарах **„парашутыстаў"**. Наш кандыдат гэта заўсёды чалавек адсюль, звязаны з гмінай і меншасцю. Нашы выбаршчыкі таксама вельмі стабільная база, найдаўжэй замацаваная ў рэгіёне. Чарговыя тэрміны паўнамоцтваў даказалі, што нашы войты ці бурмістры добра гаспадараць, а нашы людзі не будуць галасаваць на кепскіх кіраўнікоў. Стараемся, каб не было памылак у падборцы кандыдатаў, а кожны наш кандыдат мае нейкую сваю гісторыю. **Паслявыбарчы аналіз** паказвае, што на нашых кандыдатаў галасуюць таксама людзі без нямецкіх каранёў. Сімпатыі ў іх да нашай групы можа нават не быць, але высока паважаюць добрую арганізацыю. Наш **электарат дысцыплінаваны**, не можам наракаць. Таксама шмат моладзі ангажуецца ў выбарчую кампанію. У іх шмат энергіі, яны мабільныя, ведаюць сучасныя сістэмы камунікацыі ды інтэрнэт-прылады; ад старэйшых цяжка гэтага патрабаваць.

http://www.nto.pl

Бернард Гайда, старшыня Саюза нямецкіх грамадска-культурных таварыстваў у Польшчы — ***Калі прэм'ер 15 верасня абвясціў тэрмін самаўрадавых выбараў, на той час было ўжо складзеных 80% спісаў, прайшлі канвенцыі на ўзроўні гмін і паветаў.***

Ёсць і другі бок гэтай таямніцы. Вопыт паказвае, што нават калі няма мясцовага кандыдата, няма сэнсу шукаць яго ў іншым месцы і прапанаваць. Не падтрымаюць яго ўжо на гмінных канвенцыях. Зрэдку бывае, што са спісаў „Нямецкай меншасці" стартуюць **кандыдаты не з меншасці**. Тут і рызыка. Бэрнард Гайда:

— Здараліся такія кандыдаты, якія пасля старту з нашага камітэта і выбару на пасаду пакідалі нямецкія справы і адварочваліся ад ідэй, з якіх пачынаўся іх перадвыбарчы шлях. Стараемся, зразумела, пасля выпраўляць такія сітуацыі. Маем таксама свой **Самаўрадавы клуб**, які аб'ядноўвае войтаў і бурмістраў выбраных з нашага камітэта і там звяртаем увагу на рэалізацыю праграмных задач. Але трэба абавязкова памятаць, што такі войт ці бурмістр не дадзены толькі для меншасці. Бывае, што яго задачы супярэчаць інтарэсам меншасці. Тады трэба ініцыяваць дыскусію. Тут таксама сваю ролю выконваюць DFK.

Голас немцаў на Апольшчыне мае значэнне. Бывае, што ў гмінах, дзе ёсць кандыдаты на радных і натуральны электарат „Нямецкай меншасці", няма свайго кандыдата на войта ці бурмістра. Іншыя кандыдаты чакаюць тады падтрымкі з боку немцаў. Можна сказаць, што нямецкая кампанія праходзіць у ружовых колерах, але рэчаіснасць мае і свае шэрасці.

Двайная тоеснасць рэгіёна

— „Дапаможная мова" гэта, на мой погляд, мёртвы закон, — дэкларуе Рафал Бартэк, старшыня Рады гміны Хшанставіцы ды адначасна прадстаўнік немцаў у Камісіі супольнай урада і меншасцей, шчыра заангажаваны ў рэалізацыю закону аб нацыянальных меншасцях. — Можам весці неслужбовую карэспандэнцыю з гмінай, але як часта мы яе вядзем? Найчасцей патрабуем афіцыйных дакументаў. А калі мне трэба неафіцыйна пагаварыць з нейкім войтам, дык да яго іду і найчасцей, калі ён не з меншасці, гаворым па-польску, бо ён слаба валодае нямецкай. З указальнікамі таксама праблемы. Польская большасць баіцца, што знікне нешта польскае з прасторы, а мы дадаем толькі новую рысу гэтаму месцу. У рэалізацыі закону перашкаджае нам абсалютная бяздзейнасць з боку ўрада ды ўлад у кантэксце прамоцыі нашых правоў і магчымасцей іх рэалізацыі. Тое, што нашы ўказальнікі вельмі часта бываюць замалёўваны гэта не нашая праблема, толькі цэлай лакальнай грамадскасці. Патрэбная акцыя наконт акцэптацыі меншасцей. У маёй гміне ўказальнікі стаяць два гады і да сёння іх замалёўваюць. А журналісты не маюць ахвоты пра тое пісаць, хаця, калі табліцы ставілі, ўвесь час пісалі: „Навошта ўказальнікі?".

Паводле слоў Рафала Бартка дзве, найбольш тры гміны з ліку дваццаці шасці ў Апольскім ваяводстве, у якіх ёсць магчымасць увесці дапаможную мову, яшчэ гэтага не зрабілі. Каля шаснаццаці гмін таксама ўжо значацца ў рэестры тых, якія могуць ставіць дадатковыя ўказальнікі на мове меншасці. Стаяць яны пакуль у адзінаццаці гмінах.

— У большасці стаяць яны на ўездзе і выездзе, толькі ў маёй гміне, адзінай у цэлай Польшчы, ёсць таксама ўказальнікі накірункаў, — прызнае не без гонару Рафал Бартэк. — Гэта памылка, што іншыя не карыстаюцца гэтай магчымасцю. Калі прывыкаем да двухмоўя, то варта, каб не было такой шызафрэніі, што ўязджаем у Гросдыбэн / Добжынь-Велькі, а ў іншай мясцовасці ёсць толькі ўказальнік на Добжынь-Велькі. Імкнемся таксама да ўвядзення назваў вуліц, але гэта больш складаная справа. Маем вуліцу Школьную, але гістарычная яе назва гэта Кірхштрасэ (Касцельная). Дык што нам рабіць? Прыняць гістарычную ці перакладаць сучасную, тады са Школьнай атрымаецца Шульштрасэ. Што рабіць тады з вуліцамі, у якіх ідэалагізаваныя назвы, напрыклад, вуліцы Перамогі, Генералаў ці 22 Ліпеня? Дыскусіі ідуць, але пакуль што безвынікова.

Нараўчанская гміна

Абочыны дарог у зараснікaх

Павятовыя дарогі са Старога Ляўкова ў Лешукі, з Новага Ляўкова ў Лешукі ды з Плятны ў Семяноўку ў Нараўчанскай гміне патанаюць у зараснікaх. Паабапал гэтых даволі рухлівых дарог выраслі вялікія кусты вербалозу, алешніку, таполяў і бяроз. Каля 20 старых таполяў нядаўна ссеклі толькі пры дарозе са Старога Ляўкова ў Лешукі.

На дарозе са Старога Ляўкова ў Лешукі здарыўся смяротны выпадак. Мотавеласіпедыст з пасажыркай „выскачылі" з палявой дарогі а хутчэй сцяжынкі на асфальтавую шашу і трапілі пад самаход. З-за кустоў не бачылі адзін аднаго ні кіруючы мапедам, ні шафёр аўтамашыны.

Зараз, восенню, найлепшая пара ссячы зараснікі на насыпах дарог і ў равах. А ўжо неабходна гэта як найхутчэй зрабіць на скрыжаваннях дарог або там, дзе стаяць дарожныя асцерагальныя знакі. Іх таксама за кустамі не відаць.

Дзве лепшыя дарогі

Зараз два амаль двухкіламетровай даўжыні кавалкі дарог: ад Заблотчыны да Мінкоўкі і ад ваяводскай шашы Навасады — Нараўка — Бандары — Юшкаў Груд да Слабодкі ў Нараўчанскай гміне маюць асфальтавую маставую. Раней тут былі ўхабістыя маставыя з гравію.

Два-тры гады таму пры дарозе з Нараўкі ў Мінкоўку ссеклі старыя таполі. Зараз ссеклі 21 старую таполю паабапал дарогі ў Слабодку.

Шкада толькі (вось такі факт), што не закончылі пабудовы асфальтавай маставой са Слабодкі да самай ваяводскай шашы, а пакінулі яшчэ недзе 300 метраў няроўнай гравійкі. У вёсцы Слабодка асфальт ляжыць на ўсёй даўжыні.

(яц)

Навінкі з Кузавы

Неакуратна зрабілі

Здавалася мне, што праблема вырашана. Тычыцца яна ямак паміж чыгуначнымі пераездамі на дарозе Кузава — Чаромха-Вёска („Хто паклапоціцца?" — „Ніва" № 39 ад 26. 09. 2010 г.). Я наведаў гміну ў пятніцу зранку, 24 верасня. Калі сказаў пра гэта войту, тады спадар Врублеўскі ў маёй прысутнасці падняў трубку і патэлефанаваў адказнаму чыноўніку:

— У мяне ёсць спадар Сідарук з Кузавы і заяўляе, што неабходна паправіць дарогу на чыгуначных пераездах за Кузавай... Што, паправілі... сёння раніцай? Дык добра.

Кіраўнік гміны, узрадаваны, палажыў трубку і кінуў у мой бок:

— Дарогу, як бачыце, паправілі. Праверце. Калі штосьці не так, дык пазваніце. Пастараемся зрабіць па сіле нашых магчымасцей.

Два дні пазней я наведаў сябра Міхася Б. Калі загаварылі аб дзіравай гравійцы і чыгуначных пераездах, дык гэты сказаў:

— Нічога не зрабілі. Ямкі надалей засталіся. Экскаватарам адно праехалі ды параўналі дарогу. А жвіру ані каплі не падсыпалі.

(ус)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Парцава — наша бацькаўшчына

Калектыў „Луна"

Парцава, вёска распаложаная непадалёк ад Бельска-Падляшскага, апошнім часам стала мяняць свой выгляд. Шырокая асфальтаваная вуліца і нізка прыстрыжаная на абочынах трава робяць станоўчае ўражанне на прыезджых.

— Маладыя сталі купляць у нас дамы і рамантаваць іх. Рамантуюць хаты таксама нашы жыхары і нашы дзеці, што жывуць цяпер у гарадах і наведваюць нас, — заяўляе солтыс Анастасія Буркевіч, якая таксама разам з найбольш актыўнымі жыхарамі сяла мяняе воблік Парцава.

— Раней такога не было, а апошнім часам пачалі будаваць у нас ад фундаментаў ажно чатыры новыя хаты. Неяк так склалася, што будаўнічая актыўнасць распачалася пасля зруху ў нашай вёсцы ў галіне культуры, а папярэдзіла яго наша змаганне за бацькоўскую зямлю, — кажа Валянцін Галушэўскі, адзін з галоўных пачынальнікаў культурнай дзейнасці і арганізатараў вакальнага калектыву „Луна", старшыня добраахвотнай пажарнай каманды ў Парцаве, вясковы радны і старшыня Рады гміны Бельск-Падляшскі. — Мы хацелі, каб вярнулі нашым вяскоўцам зямлю, якую забралі пры народнай уладзе за непастаўленыя абавязковыя кантынгенты, а яе ўласнікам была Сельскагаспадарчае агенцтва. У 2004 годзе заснавалі мы аб'яднанне „Наша бацькаўшчына" і пісалі петыцыі ў розныя ўстановы, звяртаючы ўвагу, што без дастатковай колькасці палёў мясцовыя беларусы будуць прымушаны выязджаць у гарады. Ды не дачакаліся мы станоўчых рэзультатаў нашых намаганняў. Трапіла да нас толькі звыш дваццаці гектараў зямлі, бо не далі нам права на яе першакуплю, ці магчымасцей браць былыя нашы палеткі ў арэнду ў першую чаргу. Мы індывідуальна не былі ў змозе браць у арэнду па 130 ці нават па 35 гектараў зямлі, а рабілі гэта людзі звонку.

У статуце аб'яднання „Наша бацькаўшчына" была запісана між іншым магчымасць дзейнасці ў карысць культуры і традыцый беларускай нацыянальнай меншасці, што было прыдатным у час пазнейшай актыўнасці парцаўскага грамадства.

— Калі я стаў радным і пачаў бываць у гміне, дакладней даведаўся пра магчымасці дафінансавання вясковай дзейнасці. Мы выступілі за вонкавыя сродкі і напісалі праект, які тычыўся збірання і апрацоўкі даўніх мясцовых песень, а таксама іх надрукавання ў спеўніку. Мы рашыліся прапагандаваць нашу культуру, а дапамагалі нам у гэтым вельмі актыўная солтыс Анастасія Буркевіч і войт Раіса Раецкая. Калі мы сабралі песні, пачалі спяваць іх і пабачылі, што спеў у нас атрымліваецца нядрэнна. Рашылі мы заснаваць свой вакальны калектыў, якога раней у нас ніколі не было і запрасілі інструктарку Алу Негярэвіч ад бельскіх „Курантаў", каб дапамагла нам развучаць першыя песні, — расказвае Валянцін Галушэўскі.

12 ліпеня 2009 года ў час святкаванняў у гонар апосталаў Пятра і Паўла ў Парцаве адбылося афіцыйнае адкрыццё дзейнасці добраахвотнай пажарнай каманды, якой не было раней у гэтай вёсцы і адначасна з гэтага часу афіцыйна пачаў дзейнічаць вакальны калектыў „Луна". У пажарную каманду ўступілі 18 мужчын і 6 жанчын, а ў час першых спаборніцтваў пажарнікаў занялі яны 4 месца на агульны лік 16 каманд.

— Нам купілі мотапомпу і іншае абсталяванне для тушэння пажараў, а таксама машыну „Landrover", якой раней карысталіся пагранічнікі. Мы зрабілі капітальны рамонт гэтай машыны і зараз на ёй таксама выязджаем з калектывам на фэсты, — тлумачыць адзін з парцаўскіх пажарнікаў-самадзейнікаў.

Пачынаючы з лета мінулага года калектыў „Луна" стаў выязджаць на фэсты, а сёлета часта выступаў на беларускіх мерапрыемствах.

— Выступы з нашым калектывам гэта для мяне адыход ад штодзённасці. Весела быць разам і хочацца спяваць. Нават калі са сваімі хатнімі работамі яшчэ не ўправімся, ідзем на рэпетыцыі і развучваем новыя песні, — прызнаецца Анеля Брэчка з Парцава. — Першы наш інструктар Уладзімір Рэда быў з Украіны, але мы хацелі па-беларуску спяваць і адмовіліся ад яго.

Чарговым інструктарам „Луны" быў Міхал Аўхіменя з Беларусі, якога падаслалі нам пасля хадайніцтва ў БГКТ.

— У палове цяперашняга сезона наш калектыў астаўся без інструктара і зараз шукаем новага. Сталі мы выступаць з загадзя зробленымі для нашых песень аранжыроўкамі. Маем намер выдаць кампакт-дыск, — інфармуе спадар Галушэўскі. — Спяваем мы на чыстай беларускай мове і па-свойму. У нашым рэпертуары ёсць таксама расійскія і ўкраінскія песні, а таксама польскія творы, якія выконваем у час святкаванняў пажарнікаў, бо наш калектыў дзейнічае і пры нашай пажарнай камандзе.

Цяпер у „Луне" выступае 12 чалавек. Тры спявачкі жывуць у Галадах, а чатырох спевакоў даязджаюць на рэпетыцыі з Бельска. Калектыў за закалядаваныя грошы купіў матэрыял. Тарэса Галушэўская, прафесійная краўчыха і заадно член гурту, запраектавала і пашыла для спевакоў прыгожыя ўборы.

— Я хацела, каб уборы мелі народны характар, таму ўвяла на іх усходнеславянскія матывы, — тлумачыць Тарэса Галушэўская. — Дзейнасць у калектыве гэта магчымасць цікава праводзіць час, а таксама школа жыцця, бо мы вучымся ісці на кампраміс з іншымі асобамі і выпрацоўваць у сабе талерантнасць да іншага чалавека. Рэпертуар у нас эстрадны, песні мусяць быць вясёлымі, такімі, каб радавалі іншых людзей. Калі нам прапанавалі спяваць тужлівыя песні, яны нам не падыходзілі.

Беларускі фэст, які быў наладжаны 28 жніўня, у час святкавання ў гонар Успення Прасвятой Багародзіцы, быў першым фэстам, сарганізаваным у Парцаве прынамсі ад пяцідзесяці гадоў. Распачаўся ён з малебна ў мясцовай царкве, у якой цяпер у кожную нядзелю і ў час вялікіх святаў адбываюцца багаслужбы (вёска належыць да Уваскрасенскага прыхода ў Бельску-Падляшскім).

— „Малінкі" і мы зрабілі „перапяліцы" і дзякавалі Богу за сёлетні ўраджай. А калі калектывы заспявалі разам у царкве, то здавалася, што яна дрыжыць. Пасля малітваў паказалася сонца і прыгожае надвор'е было да канца фэсту. Выступіла 8 калектываў, а пасля ізноў стаў ісці дождж, — расказвае Валянцін Галушэўскі. Звярнуў ён увагу на вельмі прыгожае сцэнічнае афармленне. Мерапрыемства падтрымалі войт Бельскай гміны Раіса Раецкая і Галоўнае праўленне БГКТ.

— Мы, амаль усе, лічым сябе беларусамі. У нас дзейнічае беларускі калектыў, то і фэст беларускім рашыліся назваць, — заяўляе солтыс Анастасія Буркевіч, якая займаецца арганізаваннем грамадскай дзейнасці ў сяле і таксама моцна ўключаецца ў культурную работу. У Парцаве сёлета адбылася інаўгурацыя праекта па збіранні і апісанні ручнікоў, таму ў час фэсту прэзентаваліся ручнікі з падбельскіх сёл. У згаданым праекце „Наша бацькаўшчына" з Парцава з'яўляецца толькі адным з шасці аб'яднанняў, якія яго рэалізуюць.

— Удзел у праектах таксама вымяральны ў матэрыяльным маштабе. Мы, напрыклад, рэалізуючы праекты, атрымалі гукаўзмацняльную апаратуру. У Парцаве ёсць грамадска актыўныя асобы, удалося нам многа зрабіць, рэалізуем праекты, ладзім мерапрыемствы, дзейнічаем у калектыве і ад асноў сарганізавалі добраахвотную пажарную каманду, а гэта несустраканае здарэнне не толькі ў Падляшскім ваяводстве. За чатыры апошнія гады моцна памяняўся воблік нашага сяла, у якім больш чым 90% жыхароў складаюць беларусы. Людзі з суседніх сёлаў бачаць нас як вельмі актыўную грамаду. Нашы людзі хочуць працаваць у карысць сваёй вёскі, а інфармацыя пра нас у масмедыях яшчэ больш заахвочвае да актыўнасці, — пералічвае козыры дзейнасці вясковага грамадства Валянцін Галушэўскі.

Апошнім часам у Парцаве адрамантавалі клуб, купілі посуд для 50 чалавек. У святліцы мясцовыя ладзяць хаўтуры і іншыя сямейныя мерапрыемствы.

— Вонкавы рамонт нашага клуба, які быў перароблены са школьнага будынка, адбыўся яшчэ пры папярэднім солтысе. Панадворак вакол яго моцна зарос кустамі і мы, вяскоўцы, сваімі сіламі наводзілі там парадак. Пасля з дапамогай спонсараў навезлі зямлі і давялі наваколле святліцы да акуратнага выгляду. Усярэдзіне наш клуб быў рамантваны за гмінныя сродкі, але мы ў гэтых працах таксама дапамагалі, — расказвае солтыс Анастасія Буркевіч. Яна шмат нахадзілася, каб давесці да рамонтных работ, а пасля іх завяршыць.

Рэдакцыі „Ніва” ў Беластоку

Спадар Рэдактар! Міра Лукша два разы апісала тэму вёскі Лука і Казберукоў і Рыгаровічаў і два або тры разы ўцякае ад апісанай тэмы, прабуючы справу бачыць аднабакова. Таму я напісаў Вам тлумачэнні, таксама зрабіў гэта спадар Стоцкі. Я хачу, каб Вы звярнулі ўвагу на прыведзеныя ў апісанні справы. На 1. Акт інтрамісіі ад 18.06.1938 г. і „тытул выканаўчы” ад 12.02.1939 г. (Co tu jest grane?) 2. Ліст з Ваяводскай нарадовай рады Аддзела сельскай гаспадаркі RI-R-15\1-7\60 ад 10.10.1960 г. Рэдактар піша, што гэтае не было зрэалізавана, а праўда іншая, бо пасля таго ліста Ян Рыгаровіч як і Мікалай Лешчук былі дапісаны да паю ў супольнасці таму што карысталіся гэтай пашай, а апошнім было адмоўлена. 3. Чаму рэдактар так упарта піша пра луг, хаця ад 1864 года была гэта паша, калі яна нават пад вадой. 4. Напісалі Вы Мікалаю Стоцкаму, што ў справе падзелу грошай, на вашу думку — так толькі магло быць? Выразна ў нумары 30(2828) напісалі Вы: „Управа супольнасці прадала дзяржаве зямлю, узяла грошы і падзяліла паміж членамі. І канцы ў ваду”. Якраз гэта абвінавачанне цяжкае і небяспечнае. Маеце на высвятлене гэтага два выхады: даказаць, што так было, або высветліць і перапрасіць асобы і членаў супольнасці, якіх гэта кранула. Думаю, што два тыдні на гэта хопіць.

З павагай —
подпіс неразборлівы (Я. Смольскі).

Не луг, а паша!

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Наша родная паша

У лісце ад Ваяводскай рады нарадовай, які Вы прыводзіце, чыноўнік 31 кастрычніка 1960 г. вырашае аб змене рашэння з 10.10.1960 г. *w odniesieniu do gruntów w uroczysku „Zaskrzynia” **niesłusznie** dołączonych do wsi Łuka: Grunty w uroczysku „Zaskrzynia” będą zapisane w **dowodach pomiarowych** na Jana Rygorowicza s. Mikołaja i Leszczuka Mikołaja s. Stefana, w stosunku do Grycuka Aleksego oraz Kazberuków Józefa, Teodora i Dymitra **pomimo że posiadają dokumenty nabycia gruntów** w ur. „Zaskrzynia”, jednak ze względu na to, że nie użytkują tych gruntów, w dowodach pomiarowych będą **uwidocznione jako sporne** między w\w Obywatelami a użytkownikami wsi Łuka. (…) Taki zapis w dowodach pomiarowych w niczym nie przesądza tytułu własności, a uzyskanie przez Was praw do tych gruntów może być uzyskane na drodze sądowej.* Так і засталіся тыя грунты *спорнымі*.

Калі гаворка пра асобы, якім належалася плата за пай у супольным кавалку зямлі, на якой расла трава, дык ёсць дакумент на падставе артыкулаў 6, 8 і 9 закону ад 29.06.1963 г. аб добраўпарадкаванні грунтавых супольнасцей, Аддзел сельскай гаспадаркі і лясніцтва Прэзідыума Павятой нарадовай рады ў Гайнаўцы рашыў прадставіць 27.06.1964 г. спісак асоб, якія маюць права на ўдзел у грунтавай супольнасці распаложанай на тэрыторыі вёскі Лука і частцы вёскі Тарнопаль грамады Семяноўка агульным абшарам 31,738 гектараў ды спісам грунтаў, якія ў іх валоданні і належных ім паёў у супольнасці. Пералічаны наступныя асобы: Харкевіч Павел сын Антона, Харкевіч Арсень сын Антона, Харкевіч Зофія д. Аляксандра, Харкевіч Уладзіслаў с. Ігната, Грэсюк Феафіла, Красніцкая Анна д. Давіда, Кардаш Фёдар, Каральчук Аляксандр с. Амяльяна, Лобач Уладзіслаў с. Венядзікта, Лобач Сіман с. Венядзікта, Лукша Васіль с. Трафіма, Новік Марыя д. Трафіма, Новік Марыя д. Максіма, Новік Аляксандр с. Сцяпана, Новік Канстанцін с. Міхала, Новік Васіль с. Сцяпана, Пакутнік Ян с. Дзямяна, Шульскія Юлія і Міхал, Садоўскі Уладзіслаў с. Уладзіслава, Стоцкая Марыя д. Яна, Стоцкі Аляксандр с. Якуба, Стоцкі Міхал с. Якуба, Салавей Васіль с. Васіля, Смольскі Якуб, Васільчык Мікалай с. Цімафея, Васільчык Юльян с. Мікалая, Жукоўскі Сяргей с. Юльяна, Жукоўская Вольга д. Ануфрыя, Жукоўскі Герасім с. Мікалая, Жукоўскія Марыя і Вера, Анцутка Рыгор с. Сцяпана, Анцутка Уладзімір с. Сцяпана, Анцутка Андрэй с. Сцяпана, Бірыцкі Канстанцін с. Юзафа, Бойчук Аляксандр і Ян, Бойчук Антон с. Юзафа, Бірыцкі Мікалай с. Якуба, Бандарук Лук’ян с. Андрэя, Бура Мікалай с. Ануфрыя, Бірыцкая Марыя д. Яна, Буйко Міхал с. Мікалая, Харкевіч Ян с. Сімана, Жукоўскі Пілып с. Юзафа, Харкевіч Цімафей с. Яна, Харкевіч Пелагея д. Яна, Харкевіч Васіль с. Рыгора, Харкевіч Сяргей с. Рыгора, Харкевіч Фёдар с. Антона, Харкевіч Антон с. Канстанціна, Харкевіч Мікалай с. Юльяна, Харкевіч Аляксандр с. Андрэя, Харкевіч Аляксандр с. Антона, Дабжынскі Уладзіслаў с. Пятра, Грыголец Антон с. Антона, Грыц Антон с. Канстанціна, Каральчук Сяргей с. Сцяпана, Каральчук Сцяпан, Кардаш Павел сын Карнілы, Камажэўская Валянціна д. Адама, Лаўнічук Аляксандра д. Максіма, Лукша Трафім с. Сяргея, Лукша Сяргей с. Трафіма, Лобач Лявон і Сяргей, Лаўнічук Аляксандр с. Мікіты, Лаўнічук Ян с. Уладзіслава, Лаўнічук Мікалай с. Канстанціна, Місевіч Міхал с. Канстанціна, Новік Наталля д. Касьяна, Новік Юрый і Антаніна, Новік Агата д. Васіля, Новік Юльян с. Мірона, Новік Валянціна д. Міхала, Новік Цімафей с. Мікалая, Новік Міхал с. Рыгора, Новік Юльян с. Рыгора, Новік Уладзіслаў с. Яна, Новік Канстанцін с. Максіма, Раманюк Якуб с. Андрэя, Стоцкі Мікалай с. Антона, Садоўскі Уладзіслаў с. Аляксея, Садоўскі Сцяпан, Станкевіч Вераніка, Станкевіч Станіслаў с. Юзафа, Стоцкі Мікалай с. Максіма, Салавей Васіль с. Юзафа, Смольскі Пётр с. Паўла, Скепка Ян с. Васіля, Сімаковіч Аляксандр с. Аляксея, Саўко Рыгор с. Ігната, Самоцік Дзмітрый с. Паўла, Смольская Настасся д. Яна, Стоцкі Васіль с. Венядзікта, Стоцкі Ян с. Яна, Стоцкі Сяргей с. Аляксандра, Шульскі Юльян с. Аляксандра, Шульскі Ян с. Аляксандра, Стоцкая Параскева д. Антона, Стоцкі Уладзімір с. Васіля, Стоцкі Мікалай с. Цімафея, Стоцкі Максім с. Канстанціна, Трахімчук Антон с. Кандрата, Васільчык Лявон с. Герасіма, Васільчык Юльян с. Рыгора, Васільчык Тамаш с. Андрэя, Віткоўская Настасся д. Сімана, Жукоўскі Дзмітрый с. Яна, Жукоўскі Васіль с. Рыгора, Жукоўскі Пілып с. Пілыпа, Жукоўскі Пілып с. Сцяпана, Жукоўскі Уладзімір с. Мікалая, Стоцкі Аляксандр с. Андрэя, Васільчык Цімафей с. Дзям’яна, Засім Мікалай с. Пілыпа, Рыгаровіч Ян с. Мікалая, Рыгаровіч Мікалай с. Мікалая, Лешчук Мікалай с. Сцяпана. (З усёй лучанскай зямлі 21,96 гектараў належала яшчэ Дзяржаўнаму фонду зямлі). Пералік як пераклік, ад якога шчыміць у сэрцы — гэта ж усім ім гэтым аднялі родную зямлю і разагналі па свеце.

Я напісала выразна, і што Вы прывялі з маіх надрукаваных слоў, што Вы разлічыліся з братамі ў нядолі тымі грашыма, якія былі Вам даручаныя як дэлегатам ад грамады. Ды далей гаворка не пра гэта. Ці мае права на тое Ваш сусед Клаўдзій Казбярук, каб сумленна патракавана была **яго** справа? Спадарства ўпарта звяртаеце ўвагу на не найбольш істотныя дэталі, хоць найважнейшы паводле Вас — царскі дэкрэт з XIX стагоддзя і адказы чыноўнікаў павятовага ўзроўню, пісаныя каб неяк адмахнуцца ад неістотнай тэмы кавалка беларускай зямлі, якою ў той пэўнэраўскі час мала хто даражыў. Дык вось спадар Казбярук будзе дабівацца вырашэння сваёй справы, а гэта зусім не датычыць таго жмута залатовак, які дала *ўлада* лучанам за зямлю. Абсалютна! Так што не трывожцеся. На сумленных людзях шапка не можа загарэцца!

Паездка ў Беларусь

Па запрашэнні міністра культуры Рэспублікі Беларусь Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку, узначальванае Янам Сычэўскім і Валянцінай Ласкевіч, сарганізавала для бурмістраў, войтаў, дзеячаў БПКТ і актыўных удзельнікаў беларускіх самадзейных калектываў паездку ў Беларусь. Мэта паездкі, якая адбылася ў днях 17-19 верасня 2010 г., — пазнаёміць яе ўдзельнікаў з культурай і гісторыяй Беларусі.

У Брэсце пабачылі мы трагічныя паслядоўнасці нямецка-савецкай вайны. У Брэсцкай крэпасці знаходзіцца зала, прысвечаная акупацыйным жаўнерам Войска Польскага. У ёй паказаны абмундзіраванне, экіпіроўка, узбраенне.

У Косаве наведалі мы музей, прысвечаны сыну гэтай зямлі Тадэвушу Касцюшку. Упершыню я даведаўся, што першапачаткова быў ён ахрышчаны па праваслаўным абрадзе (маці Касцюшкі была праваслаўная, бацька — каталік), а пасля пераведзены ў каталіцтва. Тады праваслаўныя не мелі перспектыў развіцця і атрымання важных пасад.

Музей Якуба Коласа наблізіў нас да эпохі, у якой жыў і працаваў гэты выдатны паэт, да культуры і традыцыі.

У станоўчы спосаб здзівілі нас сучасныя канструкцыйныя развязкі ў Мінску. Нацыянальная бібліятэка, справа рук беларускіх канструктараў і архітэктараў, вартая здзіўлення жамчужына, можа змясціць 14 мільёнаў фаліянтаў. Яна поўнасцю камп’ютарызаваная, шматфункцыянальная. У ёй 24 паверхі з аглядной пляцоўкай на сталіцу.

Варты здзіўлення трохпавярховы падзямельны гандлёвы цэнтр, які нічым не горшы ад падобных цэнтраў у свеце. Звонку растуць на ім кветкі, трава, кусты і дрэвы.

Таксама еўрапейскі стандарт трымае чыгуначны вакзал. Яго шматфункцыянальнасць на высокім узроўні.

Мінск гэта горад шматлікіх будынкаў і зелені. У сталіцы паглядзелі мы спектакль „Яўген Анегін” на мове арыгінала, значыць, па-руску.

На шляху нашай паездкі апынуўся абарончы замак у Міры. Нішчаны стагоддзямі людзьмі і прыродай, цяпер ён адноўлены і даведзены да першапачатковага стану. Пабывалі мы таксама ў манастыры ў Жыровічах. Быў час, калі мелі яго ліквідаваць, аднак пратрымаўся. Атмасфера ў ім супакойвае душы наведвальнікаў.

Неспадзяванку зрабіў нам віцэ-міністр культуры Тадэвуш Стружэцкі. Па прычыне службовых абавязкаў не мог ён сустрэцца з намі ў Мінску, тады спаткаў нас у зваротнай дарозе. Гэты факт сведчыць аб тым, што ў Беларусі беларусаў Беласточчыны ацэньваюць належным чынам.

Канстанцін МАСАЛЬСКІ

Матылі

У Белавежскай пушчы ахоўваюцца месцы пражывання рэдкіх матылёў. Ажно 48 відаў пражывае на тэрыторыі запаведніка Альшанка-Мыслішчэ. Багацце фаўны матылёў гэта — побач ліку відаў — вялікая колькасць іх формаў.

44 віды гэтых прыгожых насякомых шматколернай афарбоўкі крылаў гэта ўнікумы ва ўсёй нашай краіне.

У запаведніку Падцэрква навукоўцы знайшлі 14 відаў дзённых матылёў і матылёў-краснікаў.

Варта дадаць, што адзін від выступае выключна ў запаведніку Перавалока. Два ўнікумы жывуць у запаведніку Падцэрква — толькі тут і болей нідзе. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Балаган і прыгожы парк

— Ніхто цяпер не прыбірае! — пачула я ў адказ.

Раней я спытала ў знаёмай гімназісткі, што думае наконт парадку ў сваім пакоі. Ці гэта нармальна, калі пакойчык школьніка напамінае смярдзючы сметнік?

— Але пра каго мы гаворым! — абурылася мая субяседніца. — Здаецца, я кожны тыдзень прыбіраю ў сваім пакоі.

— Давай пагаворым агульна, пра гімназістаў-аднагодкаў....

— Ну, можна.

Каб паказаць, што справа не толькі ў неахайнасці, мая субяседніца вышукала каларытны прыклад:

— На ўроках англійскай мовы мы перакладалі апавяданне, — пачала яна, — якраз пра прыбіранне. На восем апытаных школьнікаў шэсць з іх заявіла, што ненавідзіць прыбіраць. Асабліва ў сваім пакойчыку. У класе адразу падхапілі ніць зразумення і нават пахвалілі аднагодкаў з Англіі. Тым больш, што ўспрымаем іх як узор усякага парадку. А тут чытаем і бачым іншае...

І дадала:

— Балаган нікому, апрача адных бацькоў, не перашкаджае...

Цяжка сказаць штосьці насупраць *лавіне* і модзе. Таму мы павярнулі ў бок адпачынку і прыгожых пачуццяў:

— А калі вас хлопец запросіць на рандэву, вы пойдзеце ў прыгожы парк ці паграбціся ў публічнай сметніцы?

— Прашу не забывацца, што ў апавяданнях англійскіх школьнікаў, — пасмяялася мая субяседніца, — усе падаюцца за „эколагаў" і вельмі дбаюць пра чысціню прыроды!

ЗОРКА

Увага, конкурс! Беларускія загадкі

Разгадайце загадкі і дашліце адказы ў рэдакцыю (да канца кастрычніка, найлепш па электроннай пошце). Тут вас чакаюць каляровыя беларускія кніжкі для дзяцей.

1. Нястомны конь
Конь без грывы,
Без хваста,
бегаў дзень
і не прыстаў.
Я хутчэй кручу педалі
І імчуся далей-далей...

2. Гультай
Наш дваровы чэмпіён —
Аж пад неба скача ён.
Сам не хоча,
Трэба біць.
Як не б'еш —
Гультай ляжыць.

3. Усім яны трэба
Імі крояць, выцінаюць.
Нават дзеткі тое знаюць,
Што кашуляў ды спадніц
Не нашыюць без...

(у конкурсе мы скарысталі загадкі Н. А. Сторажава)

Вершы Міры Лукшы

Расціслаў

Імя выбрала бабуля
Расціславу, свайму ўнуку.
Будзе слаўным рос сынуля!
У мастацтве ці ў навуцы
будзе мець ён дасягненні! —
меркавалі тата з мамай,
падаючы есці ў роцік,
каб і смачненькім таксама
моц у сабе накачваў Росцік.
Ужо на першых нарадзінах
ужо было відавочна:
Росцік рос не па гадзінах,
на дражджах уверх падскочыў!
А цяпер, у першым класе
рост вышэйшы з усіх мае.
Вось варожба ўдалася!
А пра поспех — пачакаем!

Іграем саміх сябе!

Усе мы любім сваіх дзядуляў і бабуль. Для іх паказваем свае школьныя ацэнкі, часам, каб даказаць ім сваю любоў, дэкламуем беларускія вершы або спяваем свае песні.

Ад некалькіх гадоў у Нарве рыхтуюць спектаклі на *сваёй* мове. Так агульна называем беларускія дыялекты, на якіх яшчэ размаўляюць у хаце дзядоў. Выступленні маюць добры загаловак: „Жыве яшчэ традыцыя!"

Іх ставяць і паказваюць найперш для бацькоў ды запрошаных гасцей.

Дарослая публіка ў адказ смяецца, быццам не спадзявалася такога павароту... І як не цікава — часта такія спектаклі ставяць настаўнікі-спецыялісты па ўсіх прадметах (найчасцей выхавацелі інтэграваных класаў I-III), якія *сваю мову* лічаць часткай рэгіянальнай культуры.

Падобны падыход у настаўнікаў і бацькоў, якія прыводзяць дзетак у беларускае прадшколле. Аказваецца, што ўсім нам падабаецца, калі іграем саміх сябе. А ўжо найбольш нашым бабулям і дзядулям — яны звычайна ганарацца такімі ўнукамі!

ЗОРКА

Падводны горад

(брэтонская легенда)

У Карнваліі, пры панаванні караля Градлёна, знік з зямлі цудоўны горад. Загвоздка ў тым, што хоць горад прапаў, старажытныя, а нават сучасныя брэтонцы вераць у яго існаванне. Паслухайце...

У слаўнага караля Градлёна была дачка прыгажуня Дагуд. Яе імя значыла Добрая Чарадзейка. Хапіла, каб яна нешта падумала, і ўсё ішло па яе думцы. Дагуд ведала, што добрыя справы трэба рабіць асцярожна і перадумана. Большасць добрых учынкаў яна выконвала ў таямніцы перад людзьмі. Але ўсе ведалі моц прынцэсы і абачліва выконвалі яе пажаданні і загады. Калі Дагуд загадала пабудаваць для сябе на нізкім беразе мора горад, ніхто не смеў ёй пярэчыць. Наадварот, дойліды, якіх сцягнулі з усяго каралеўства, спаборнічалі ў прыгажосці замкаў, палацаў і вежаў, а кароль не шкадаваў золата. Пабудаваны імі горад выглядаў казачна, палацы з белага мармуру і марскіх каралаў адбіваліся ў блакітным люстры мора. Па вуліцах хадзілі напыхлівыя паўліны і персідскія каты з паднятымі пушыстымі хвастамі. Жыхары, якіх запрасіла ў свой горад Дагуд, ад рання да рання пілі віно, елі больш чым хацелі, спявалі ды іграли на дудах, бавілі час на турнірах. Кожны, хто прыязджаў у горад Добрай Чараўніцы, хацеў у ім застацца і жыць да скону.

Але, як вядома, за роскаш, прыгажосці і забавы трэба плаціць. Першай ахвярай стала сама прынцэса. Наглядзеўшыся на вяселлі і гульбішчы сваіх падданых, яна забылася пра шляхетнасць. Дзесьці прапала яе разважнасць і чуйнасць ды прага дапамагаць іншым. Вакол Дагуд сталі круціцца тусоўшчыкі і падазроныя тыпы. З часам яна сама апынулася пад іх уплывам. Пра каралеву пачалі шаптаць нясмачныя чуткі. Нібыта яна маніла на моры матросаў, каб пасля жыўцом кідаць іх з вежы ў ваду!

Гэта канчаткова разгневала Бога.

— *А няхай цябе бура!* — прасіпеў разгневаны ўладар неба і зямлі ды паслаў на горад Дагун дзікую стыхію. Успененае мора разарвала плаціну, уварвалася ў горад і затапіла палацы. Але Дагуд не загінула. Яна жыве ў падводным палацы і чакае моманту, калі Усявышні прабачыць яе правіны ды дазволіць вярнуцца жыць на зямлю. Тады зноў яе горад, які брэтонцы называюць Ys (на іх мове: падводны горад), будзе самым прыгожым, багатым, але і разважным на зямлі.

— *Брэтонцы — мільённы кельцкі народ, які жыве на паўночна-заходнім рубяжы Францыі ў рэгіёне Брэтань. У іх, як і ў нас, адзін з буйнейшых гарадоў — Брэст.*

Беларусь і мая сям'я

Мая сям'я звязана з краінай, якая завецца Беларусь. Мама — беларуска, а бацька — паляк. Выходзіць, што ў маіх жылах цячэ і беларуская, і польская кроў.

А ўсё пачалося з таго, што мой прапрапрадзед Пятро, які пачаткова жыў каля Ломжы, дастаў ад цара за свае заслугі кусочак зямлі на захадзе Беларусі і перасяліўся туды жыць. Так паўстала вёска Курпі. Гэта вельмі прывабны кусочак беларускай зямлі. З усіх бакоў акружаны лесам, а адразу за вёскай цячэ імкліва рачулка Заняпішка. Яе чыстая вада ўпадае ў Котру, а Котра ў Нёман.

На сутоках рэк Нёман і Гараднічанка заснаваны горад Гродна. Там доўга жыла мая мама, пакуль не прыехала ў Польшчу і не закахалася ў майго бацьку.

Кожны год мы наведваем Гродна.

Гродна параўноўваецца з міфалагічнай птушкай феніксам, якая адрадзілася з попелу. У гэтым няма перабольшвання. Шмат разоў яго разбуралі і грабілі іншаземныя полчышчы, знішчалі пажары і паводкі. Але талент і працавітасць гараджан напаўняла яго новым жыццём. Асаблівасць і прывабнасць надае гораду архітэктурны ансамбль старой яго часткі. Прыемна пахадзіць па старых вуліцах з невялікімі зялёнымі панадворкамі. Кожны з іх быццам музейны экспанат. Гэтыя вулачкі помняць імклівыя крокі Пятра Першага, па іх хадзіла Элаіза Ажэшка.

Асабліва цікавіць мяне цуд дванаццатага стагоддзя, гордасць беларускай зямлі — Барысаглебская царква з рознакаляровымі валунамі. У сонцы царква зіхаціць і здаецца, што гэта райская птушка.

У нашым доме ў Бельску ёсць памятныя рэчы, прывезеныя з Беларусі. Гэта аўтарскія ўрачэбныя кнігі прапрапрадзеда, выдадзеныя ў 1828 годзе, ступка для парашкоў, а таксама ручнікі і дываны, зробленыя і вышываныя маімі прабабулямі.

Мая бабуля Ірэна мае залатыя рукі. Яны ўмеюць смачна варыць розныя стравы, рабіць на прутках, вышываць, ткаць, але найважнейшае — туліць да сябе ўнукаў. Як мы з братам былі малыя, яна вадзіла нас на рэчку, паказвала нам водныя лілеі. Расказвала, якое жыццё было ў нашых продкаў.

У маіх продкаў заняткаў было шмат. Мае дзяды з пакалення ў пакаленне лячылі людзей. Прапрадзед Пётр займаўся лячэннем людзей, а прапрабабуля — хатняй гаспадаркай. Яна варыла, пякла хлеб, займалася выхаваннем дзяцей. У вольны час яна ткала ручнікі, дываны, шыла вопратку. Кожнага дня было шмат работы: то ў хаце, то ў полі, ці ў агародзе.

А ў нядзелю ўсе ішлі ў святыню падзякаваць Богу за дабрабыт. Потым быў абед і адпачынак. Бацькі гутарылі аб штодзённых клопатах, а дзеці гулялі на панадворку.

Калі прыходзіла восень, усе рыхтаваліся да зімы. Зімы тады былі доўгія, з сярдзітымі маразамі.

Найбольшай радасцю было чаканне Каляд, да якіх усе старанна рыхтаваліся. Прыбіралі хату, ставілі ёлку, варылі стравы. На стале заўсёды было іх дванаццаць. Пад белым абрусам пакладзена сена. У хаце ўрачыста і цёпла. Уся сям'я за сталом. Дзяўчаты на картачках выпісвалі мужчынскія імёны, клалі іх пад падушку, а рана выцягвалі адну. Такім чынам хацелі ведаць імя будучага мужа. Мая мама выцягнула картачку з імем Вінцэнты і за яго выйшла замуж.

А было гэта так. Мама сябравала з дзяўчынай з Бельска і па запрашэнні прыехала да яе ў госці. Там спаткала майго бацьку. Мама так яму спадабалася, што на наступны дзень ён прынёс запрашэнне, каб яшчэ раз прыехала. Пасля трох гадоў знаёмства пажаніліся, і мама прыехала ў Бельск.

Так паўстала нашая сям'я — мама, тата, я і мой брат Рафал.

Мама працуе аптэкарам у адной з бельскіх аптэк. У горадзе маму паважаюць за яе прафесіяналізм і сардэчнасць да наведвальнікаў аптэкі.

Я і мой брат вучымся ў школе з беларускай мовай, каб прадоўжыць беларускую нацыю, а таксама, каб вывучыць мову сваіх дзядоў.

Вось такія сувязі маёй сям'і з Беларуссю.

Іаанна НЯВІНСКАЯ

Комплекс школ з дадатковым вывучэннем беларускай мовы імя Я. Кастыцэвіча ў Бельску-Падляшскім, першае месца ў намінацыі „Беларусь у гісторыі маёй сям'і" (13-15 гадоў)

„Беларускія красачкі", Дыяна Койла і Паўліна Мікалаюк

Польска-беларуская крыжаванка № 41

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 37:

Нюх, душ, амур, іскра, гісторыя, званок, но, Ікар, гіт, атам, лаза. На, нізка, сват, гітара, сон, крок, шарык, мая, ніз, работа.

Узнагароду, каляровыя алоўкі, выйграла **Юстына Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



У новым нумары „Тэрмапілаў"

Літаратурна-мастацкі і літаратуразнаўчы штогоднік „Тэрмапілы", што выдаецца ў Беластоку з 1998 года Беларускім літаратурным аб'яднаннем „Белавежа" пад рэдакцыяй прафесара Яна Чыквіна, выпусціў новы — 14 нумар. Зборнік вельмі самавіты — на 356 старонках, у сваім змесце ахоплівае творчасць беларускіх аўтараў — паэтаў, празаікаў, навукоўцаў ды мастакоў з абсягу ўсяго свету, таксама ў перакладах сусветных імёнаў. Словам — ад Бадлера да Яновіча. І з розных пакаленняў — ад знакамітых прызнаных аўтараў, праз маладняк Беласточчыны і Беларусі, аж па далёкае замежжа. Незалежна ад палітычных і творчых саюзаў, адно важкае — слова. Уперамежку — сівавалосы Янка Сіпакоў, наступны — гродзенскі Анатоль Брусэвіч (і з перакладам ён Яна Каханоўскага), брэсцкі Алесь Каско — крынскі Сакрат Яновіч (працяг дзённікаў), сталыя аўтары — жыровіцкі Зьніч, гродзенскія Марыя Шаўчонак і Галіна Самойла, „белавежцы" Віктар Стахвюк (з вершамі на трасцяніцкай гаворцы), Юрый Баена і Міра Лукша ды Вольга Шынкарэнка ўжо не з даследаваннямі, а з вершамі ды паэт і бард Алесь Паплаўскі (Брэст) — і наймалодшае пакаленне — Святлана Варонік, Юрка Буйнюк. І занатоўкі са свайго і іншага беларускага жыцця — Галіны Сеўрук, Радзіма Гарэцкага, Уладзіміра Мархеля, развагі Міхася Слямнёва і Кастуся Карпекіна пра Шарля Бадлера ды іхні пераклад тэкстаў, але і першапублікацыя даклада Адама Мальдзіся „Культурная спадчына павінна аб'ядноўваць, а не раз'ядноўваць людзей" (які прачытаў ён на саміце кіраўнікоў Цэнтральнай Еўропы ў 1997 г.). Пра мастацтва піша Уладзімір Хін з Мінска — пра вобраз і слова ў гравюры. Вельмі цікавы літаратуразнаўчы артыкул Аліны Сабуць „Сучасная найноўшая паэзія: ад афрыканскіх тамтамаў да Купалавай спадчыны". Ала Петрушкевіч раздумвае над паэзіяй нядаўняга юнака Анатоля Брусэвіча („Падаць у неба — гэта прыгожа"), Кацярына Іванюк (Беласток — Донкастэр) аналізуе рэцэпцыю Васіля Быкава на Захадзе. У анатацыях — кароценькія рэцэнзіі на некаторыя мінулагоднія выданні беларускіх аўтараў. А выйшлі летась: „Шчадруха" Алены Анішэўскай, „Крышынкі" Васіля Петручука, „Łatwo powiedzieć" Уладзіміра Саўчука, „Адно жыццё" Яна Чыквіна, „Подых хвілін" і „Patos jesienny" Дзмітрыя Шатыловіча, першы том „Białorutenistyki Białostockiej", „Кроплі літар" Юстыны Каролька (Грыцюк), „Ветразь успамінаў" Жэні Мартынюк, „Бурштынавы яблык" Галіны Твараповіч, „Literatury wschodniosłowiańskie. Z najnow-

Бельскія белліцэісты

Васіль САКОЎСКІ

Я таксама выпускнік Бельскага беларускага ліцэя і моцна ганаруся гэтым. Правучыўся ў ім ад 1952 да 1956 года, значыць, з'яўляюся выхаванцам Яраслава Васільевіча Кастыцэвіча — і гэта забавязвае мяне і яго выхаванцаў да многага. Яраслаў Васільевіч — гэта не проста ліцэйскі дырэктар, а цэлая інстытуцыя, а ліцэй — проста наш універсітэт. Беларускае школьніцтва, беларускае нацыянальнае адраджэнне непарыўна звязаны з яго асобай. Немалыя заслугі яго і ў тым, што нашае тутэйшае праваслаўе даволі пераможна прайшло праз цяжкія гады санацыі, акупацый і найцяжэйшы перыяд народнай улады. Усімі гэтымі справамі займаўся Кастыцэвіч і меў станоўчы ўплыў на іх. Проста прадстаўнікі тадышніх улад, хаця і былі ідэйнымі праціўнікамі беларускіх нацыянальных і рэлігійных спраў, часта не маглі адказаць гэтаму разумнаму, адукаванаму, інтэлігентнаму і — як бы цяпер сказалі — надзеленаму харызмай чалавеку. Менавіта гэтыя рысы дапамагалі яму таксама вырвацца з савецкіх кіпцюроў. Такім быў наш Яраслаў Васільевіч — і людзі ведалі аб гэтым.

Вось таму з выбарам сярэдняй школы клопатаў у мяне не было. Я і мае бацькі ведалі ўжо загадзя, што маёй сярэдняй школай павінен быць Бельскі беларускі ліцэй. Гэты ліцэй быў моцна папулярны тады. І так, здаўшы ў 1952 годзе ўступныя экзамены, я стаў вучнем ліцэя. Навука ў ліцэі была аднак нялёгкая. Веды ў пачатковых вясковых пасляваенных школах многія з нас атрымалі слабенькія. Вельмі цяжка было таксма прыстасавацца да ўмоў гарадскога і самастойнага жыцця, здалёк ад роднай вёскі і таты з мамай. Да таго ж вялікай перашкодай былі пастаянныя матэрыяльныя нястачы. Ліцэй быў перапоўнены. Восьмыя класы налічвалі па больш чым сорак вучняў у кожным класе. Дысцыпліна ў ліцэі была суровая і трымаў яе ў асноўным дырэктар — старой даты педагог. Гэта ён быў усяму галава. Спазненняў, прагулаў, нават мінімальнай правіннасці ён не пераносіў — успрымаў іх проста як асабістую знявагу. Дысцыпліну і паслушэнства лічыў ён важнейшым выхаваўчым элементам. З поўнай адказнасцю можна сказаць, што наш ліцэй быў тады школай, у якой выхаваўчая сітэма дзейнічала згодна прынцыпу: за аднаго бітага двух нябітых даюць. Падобна паступалі і іншыя педагогі. І правільна, хаця ў той час нам так не здавалася. І такой дысцыпліны, і стражнікаў яе мы не надта любілі і стараліся здалёк абмінаць іх, хаця не заўсёды нам удавалася гэта. Амаль на кожным „апэлі" наш шаноўны дырэктар або кагосьці хваліў, бо хваліць ён таксама ўмеў і любіў, або кагосьці граміў. За нашы правіненні былі розныя кары. У цяжэйшых выпадках, напрыклад, выпіўка, дробнае хуліганства ці калі выкрылі, што вучань сам сабе даставіў цішком у дзённіку ацэнку, дырэктар патрабаваў прыйсці ў школу не толькі кроўным бацькам віноўніка, але і хросным бацькам. Так балюча здымалі з нас грубы і цвёрды слой шурпатасці і непакорлівасці. Канешне, такія суровыя адносіны дырэктара былі толькі да вучняў пачатковых класаў ліцэя...

Толькі пазней мы зразумелі, што Яраслаў Васільевіч з'яўляецца не толькі суровым дырэктарам, але і, можна сказаць, клапатлівым нашым бацькам. Усе яго дырэктарскія дзеянні былі падпарадкаваны аднаму — зрабіць з нас добрых, культурных, разумных, адукаваных людзей і, канешне ж, свядомых беларусаў і веруючых праваслаўных.

Бельскі беларускі ліцэй, пад яго кіраўніцтвам, быў своеасаблівай школай, са своеасаблівай свойскай атмасферай у ёй. У сценах яго гучала як польская мова, так і ўсе іншыя мясцовыя беларускія дыялекты. Але ў ліцэі пазнавалі мы і беларускую літаратурную мову, беларускую літаратуру, гісторыю, заблытаную, але цікавую і багатую мінуўшчыну нашай мясцовасці.

З танцавальным калектывам, хорам з багатым беларускім рэпертуарам і духавым аркестрам мы часта выступалі ў Бельску і цэлай нашай бліжэйшай і далейшай аколіцы. Нашы выступленні карысталіся вялікай папулярнасцю і славілі Беларускі ліцэй і нашу беларускую культуру і меншасць. І нас, і нашых гледачоў і слухачоў наглядна пераконвалі яны, што мы і наша беларуская мова і культура не горшыя ад іншых народаў, іх моў і культур...

Асаблівай увагай і павагай карысталіся ў нашага дырэктара вучні апошніх класаў. Пачынаючы ўжо з дзесятага класа Яраслаў Васільевіч праводзіў з намі і нашымі бацькамі гутаркі на тэму далейшай жыццёвай дарогі. Дараджаў куды варта кіравацца пасля заканчэння ліцэя. І такія гутаркі былі нам моцна патрэбныя, бо ані ў нас, ані ў нашых бацькоў дастатковай арыентацыі ў гэтай справе не было. Калі той, хто на яго думку павінен далей вучыцца, не падаваў дакументаў, наш дырэктар сам мог паехаць да яго дому. З такой мэтай прыязджаў і да мяне на вёску.

Калі школу наведвалі выпускнікі, якія даўней закончылі школу, дырэктар вельмі ахвотна прымаў іх, абводзіў па школе, расказваў пра школу і распытваў пра іх справы...

Той час быў вельмі атэістычным часам. Ад дырэктара школы проста адміністрацыйна патрабавалася выхоўваць маладое пакаленне ў атэістычным духу. Яраслаў Васільевіч і ў гэтым сэнсе не зблазніўся ніколі, як многія іншыя нашы ўра-патрыёты. Мы ніколі не пачулі ад яго антырэлігійных выказванняў і ні перад кім не скрываў ён таго, што з'яўляецца моцна веруючым і праваслаўным. Калі ў праваслаўныя святы трэба было хадзіць у школу, дырэктар абавязкова вымагаў хадзіць і сам прыходзіў. А ў вольныя нядзелі і святы яго бачылі ў царкве. Бадай не было такога Яна (парафіяльнае свята ў нашым Пасынкаўскім прыходзе, кіламетраў дзевяць ад Бельска), каб Яраслаў Васільевіч на свам старэнькім веласіпедзе не прыехаў туды і не памаліўся ў нашай царкве і не сустрэўся з многімі сваімі знаёмымі каля храма. І гэта быў найлепшы прыклад нам, маладым. Я ганаруся тым, што закончыў менавіта гэты ліцэй і што маім дырэктарам быў Яраслаў Васільевіч Кастыцэвіч...

Трэба крыху сказаць тут і пра той пасляваенны час, калі адбываліся апісаныя мною падзеі. Быў ён канешне нялёгкі, і вядома чаму — вынік акупацыі і ваенных разрух. Сёлы і гарады нашы былі максімальна знішчаныя, занядбаныя, пакалечаныя. Людзі — таксама. Да таго ж вёскі перанаселеныя. Такі пасаг атрымала народная ўлада, а і яна часта была не бязгрэшнай. Не заўсёды ўмела зрабіць добра, разумна; не заўсёды хацела так зрабіць і не заўсёды так магла. Прагібаў было адным словам мноства. Гэтыя прагібы балюча адчула і мая сям'я. Але і я ў народную ўладу каменем не кіну. Апрача прагібаў, бед паявілася нямала добрага, станоўчага — адкрылася перад намі, бедакамі і пахілымі, шырокая дарога ў навуку, у людзі. Нарэшце перастала перашкаджаць нізкае і беднае паходжанне і трэфнае, паводле ўлад, веравызнанне. А менавіта яны так балюча перашкаджалі многім ранейшым пакаленням. І канешне ж, не будзь пасля вайны народнай улады, а так хвалёныя цяпер парадкі санацыйнай Польшчы — „всё опять повторилось бы сначала". Сядзелі б мы ў бедных, перанаселеных вёсках і на ліхенькіх палетках. Не памагла б нам ні наша традыцыйная лаяльнасць, ні харызма паважанага Яраслава Кастыцэвіча. І трэба аб гэтым помніць, мужыкі!..

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Праваслаўе ў Рэчы Паспалітай

Сяргеяс Тэмчынас (Вільнюс) і Антон Мірановіч

23 і 24 верасня ў Беластоку і Супраслі адбылася навуковая канферэнцыя на тэму „Праваслаўныя ў гісторыі Рэчы Паспалітай", ладжаная Супрасльскай акадэміяй і Універсітэтам у Беластоку. На канферэнцыі былі зачытаны каля паўтара дзесятка дакладаў рознай адлегласці ад стрыжнявой тэмы канферэнцыі. Я пастараюся больш грунтоўна паказаць толькі тыя лекцыі, якія кранаюць галоўным чынам нашу мясцовую гісторыю.

Найбольш цікавым лічу даклад, зачытаны прафесарам Антонам Мірановічам, на тэму „Праваслаўныя жонкі і мацеры польскіх каралёў і князёў". Дарэчы, сам дакладчык пра аб'ект сваіх доследаў прызнаўся: „Сам я не спадзяваўся, што іх столькі было". А было так, што амаль усе каралі і князі з роду Пястаў мелі праваслаўных жонак або мацярэй. Для прыкладу: дачка Баляслава Храбрага стала жонкай тураўскага і кіеўскага князя Святаполка Яраполчыча. Сын Яраслава Мудрага ажаніўся з дачкою Казіміра Аднавіцеля, Баляслаў Крывавусты быў жанаты з дачкой кіеўскага князя, ягоная дачка выйшла замуж за рускага князя, ягоны сын ажаніўся з ноўгарадскай князёўнай, а ягоная сястра была жонкай таксама ноўгарадскага князя і г.д. Ды не толькі польскія каралі і князі радніліся з праваслаўнымі, іхнія вяльможы таксама сваталіся на ўсходзе. Гэтаму звычаю прабавала супрацьстаўляцца духавенства, напрыклад, Феадосій Пячэрскі патрабаваў не дзяліць стала з іншаверцамі і не браць „горшых" католікаў.

У тую эпоху, аднак, сямейныя повязі былі важнейшыя чым канфесійныя падзелы ў выніку зусім свежай, неўкаранёнай яшчэ Вялікай схізмы 1054 года. Не было тады ў польскай знаці адмоўнага стаўлення да праваслаўных. Праўда, заўважалася гэта ў перапісцы з Рымам ці нямецкімі біскупамі, аднак у самой Польшчы не было пра гэта і мовы. Усе мазавецкія князі былі жанатыя з рускімі прынцэсамі. У Плоцку ў другой палове XIII стагоддзя не было лацінскага малітоўніка, толькі рускія. Інтэр'еры касцёлаў на Вавелі, у Гнезне, Сандоміры ці Вісліцы захавалі сляды ўсходняга ўплыву. Лешак Чорны меў рускую жонку, сястра Уладзіслава Лакетка была жонкай галіцкага князя Юрыя, а дачка апошняга стала жонкай польскага князя. Дарэчы, Лакетак быў апошнім такім польскім уладаром, а пасля яго працэс раднення польскіх вяльможаў з праваслаўнымі пайшоў на спад.

Калі на польскі трон уступілі Ягайлавічы, большасць літоўскіх эліт прыняла праваслаўе, але баялася растварыцца ў рускай праваслаўнай масе, таму яны прымалі новую каталіцкую канфесію. Раней Гедзімін з гэтай мэтай захаваў пры язычніцтве таго свайго сына, які меў стаць ягоным галоўным пераемнікам. І вось за Ягайлам менавіта гэтыя неафіты сталі ўводзіць дыскрымінацыйныя для праваслаўя законы; пазней мешаныя сужонствы былі забаронены Сеймам.

Чаму ягайлаўскі дэсант на польскім троне так памяняў стаўленне да праваслаўных? Пры Казіміры Вялікім Польшча перасунула сваю тэрыторыю на ўсход і страціла маналітную этнічную і канфесійную структуру, захопліваючы вялікую колькасць праваслаўнага насельніцтва. Традыцыйныя эліты, каталіцкія, дзеля захавання ўлады сталі патрабаваць захавання канфесійнай дамінацыі; і так пайшло-паехала, усё далей адыходзячы ад талерантнай традыцыі Пястаў і забываючы яе. Наступ на цэрквы ў эпоху II Рэчы Паспалітай браўся з атаясамлівання праваслаўя з перыядам XIX стагоддзя ў забыцці пра традыцыі эпохі пачатку польскай дзяржаўнасці. Напрыклад, царкву ў Шчабрэшыне з 1597 года знеслі тлумачачы, што яна ад царскага панавання. Але і цяпер, у XXI стагоддзі, Святакрыжская капліца на Вавелі, у якой захавалася шмат візантыйскіх фрэскаў з 1470 года, увесь час закрыта, быццам для рамонту...

Даволі цікавым — на мой погляд — быў даклад Нікаля Казар'яна з Парыжа пра карэспандэнцыю з другой паловы XVI стагоддзя паміж усяленскім патрыярхам Іярэміям II і лютэранскімі багасловамі з Цюбінгенскага ўніверсітэта. Можа гэты эпізод падацца малаважным, але магчыма, што ён адыграў важную ролю ў станаўленні Брэсцкай уніі, а гэта значыць у станаўленні нашага тутэйшага цяперашняга канфесійнага краявіду. XVI стагоддзе было эпохай канфесійнага ферменту — змагання, бо ж у той час пабачыў свет важны рэлігійны суб'ект — пратэстантызм, але таксама пошукаў паразумення паміж імі перад пагрозай з усходу ў выглядзе Асманскай імперыі.

Згаданая карэспандэнцыя важная галоўным чынам зместам лістоў усяленскага патрыярха Іярэміі II. Было іх тры, першы, найбольш змястоўны, быў напісаны ў 1576 годзе і па сутнасці быў меркаваннем патрыярха Іярэміі II наконт „Аўгсбургскага веравызнання" — асноў лютэранскай тэалогіі. Уплывы Канстанцінопаля, Рыма і Цюбінгена сутыкнуліся ў той час у Рэчы Паспалітай, праз якую з Германіі ў Турцыю ездзілі „пісьманосцы". Кракаўскі езуіт Станіслаў Сакалоўскі, давераны караля Стэфана Баторыя, атрымаў ад гэтых пасыльных змест патрыяршага меркавання і палічыў яго важным сродкам змагання з пратэстанцкімі поглядамі. У 1582 годзе Сакалоўскі апублікаваў у Кракаве лацінскі пераклад патрыяршага пісьма, дадаўшы да яго свае каментарыі; кніга атрымала названне „Censura Orientalis" („Меркаванне Усходняй царквы пра галоўную дактрыну цяперашніх ерэтыкаў"). „Цэнзура" была хутка перавыдадзена на захадзе Еўропы, а ейныя крытычныя ў адносінах да лютэранства тэзісы цытаваліся ў тэалагічных спрэчках яшчэ ў пачатку XX стагоддзя. Сам папа Грыгорый XIII паслаў патрыярху адмысловыя віншаванні. Публікацыя „Цэнзуры" раскалола карэспандэнцыю Канстанцінопаля з Цюбінгенам і абнадзеіла папістаў на падпарадкаванне Іярэміі; узнікла нават думка пераводу патрыяршай сядзібы ў Маскву або Кіеў. Невядомае стаўленне да гэтай задумы самога патрыярха Іярэміі II, бо занадта згаворлівым з лацінікамі ён не быў, пра што сведчыць адмова прыняцця ім новага, запрапанаванага папам Грыгорыем XIII грыгарыянскага календара. Ад сябе дадам, што да таго ж усяго падчас свайго візіту ў Маскву ў 1589 годзе канстанцінопальскі ўладыка быў прымушаны тамашнімі сілавікамі да заснавання новага патрыярхату з чыста маскоўскім персаналам. Варта таксама прыгадаць, што тадышняе маскоўскае праваслаўе было — па сённяшніх мерках — стараверствам... Вяртаючыся цераз Рэч Паспалітую Іярэмія II запатрабаваў ад сваіх епіскапаў прыстойнейшых паводзін, раздражняючы іх. Не спалі і езуіты. Неўзабаве адбыўся Брэсцкі сабор. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што Брэсцкая ўнія не была адно дзецішчам польскіх і рымскіх палітыкаў — праваслаўныя епіскапы, раздражненыя мерамі патрыярха Іярэміі II, запатрабавалі яе...

Яшчэ слоў пару пра даклад Давіда Роснака, які кранаў наступ бальшавікоў на Праваслаўную царкву ў Расіі. Была гэта прадуманая акцыя з прымяненнем раскольніцкіх штучак. Царква ў Расіі ў час станаўлення ўлады бальшавікоў вялікага аўтарытэту не мела. У той катавасіі, якая тады ўзнікла ў Расіі, узнікалі і розныя канфесійныя ідэі, напрыклад, узнік напрамак „працоўных абнаўленцаў", якія сваёй задачай лічылі выгнанне буржуяў з храмаў. Некаторыя такія плыні безумоўна інспіраваліся ўладамі, у тым ліку і пасрэдніцтвам усяленскага патрыярха Грыгорыя VII. Пасля Першай сусветнай вайны Расія аддала Турцыі Карс з наваколлем і турэцкі ўрад з удзячнасцю націскаў канстанцінопальскага патрыярха на падтрымку выгадных Крамлю плыняў у рускім праваслаўі...

Іншыя даклады краналі, галоўным чынам, тэмы больш цікавыя дапытлівым вучоным чым масаваму абывацелю, шмат з іх было прысвечаных канкрэтным асобам, часта чыста фармальна звязаных з праваслаўем у Рэчы Паспалітай, напрыклад, грэчаскім палітыкам інспіраваным праваслаўем, таму дазволю сабе пакінуць зацікаўленне імі вузкаму колу даследчыкаў.

szych badań. Księga dedykowana Profesorowi Janowi Czykwinowi w siedemdziesięciolecie urodzin" ды „Беларуская літаратура XVI-XX стст. Працы кафедры беларускай філалогіі" пад рэдакцыяй Галіны Тварановіч.

Вельмі прыемна знайсці сярод знакамітай кампаніі аўтараў дэбютанцкія творы Кацярыны Сянкевіч, вучаніцы Мастацкага ліцэя ў Супраслі, удзельніцы мінулагодняга агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы „Дэбют", арганізаванага „Нівай" і Беларускім саюзам у Польшчы. Падборка твораў маладой паэтэсы і таленавітай мастачкі захапляе спеласцю і вобразнасцю. На творчасць гэтай працавітай і сціплай маладой асобы можам углядацца з надзеяй. Для таго і арганізуецца конкурс Дэбют (сёлета XIII выпуск), каб вылавіць такія перлавіны і памагчы ім у дэбюце. У новым нумары „Тэрмапілаў" іншым удзельнікам ніўскага конкурсу і яго лаўрэатам быў Юрка Буйнюк, цяпер аўтар ужо двух зборнікаў лірыкі.

Міра ЛУКША

Кацярына СЯНКЕВІЧ

* * *

калі паміраюць мары
пакута мае смак папсаваных яблык
прыгадваюць жывых вос
нічога на памагае нават прасціна
поўная слёз,
апошні покліч гасіць агонь

Калі паміраюць мары
паміраюць таксама душы людзей
хачу ўсмешкі, ледзь чутнага слова

Рукой ветру ёсць надзея,
а над намі ўсё плыве неба,
не хачу ісці жыць глыбока
ў няздзейсненую зямлю
д'ябла

Божа

* * *

я знайшла сухія вусны і пару алоўкаў
знайшла наіўнасць
памаляваную чырвоным
самота чалавека чакае мяне толькі
на беразе неіснавання

Калі яе няма

калі яе няма толькі тады я ёсць
прысвячаеш мне нават позірк
дзякую

калі ты з ёю і бачыш мяне
апускаеш галаву
каб паглядзець у вочы мурашкам

„Пінская шляхта” ў Варшаве

Міхась СЦЕПАНЮК

Апошняя сцэна спектакля. Пасвараным героям не засталося амаль нічога апрача іх шляхецтва. Моўчкі падносяць угару свае гербы. А пасля гарачыя воплескі. У варшаўскім тэатры „Рампа” канчаецца прэм’ера „Пінскай шляхты” Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

— Ідэя паставіць „Пінскую шляхту” ў Варшаве ўзнікла нейкі час таму, — кажа рэжысёр спектакля Мікалай Пінігін, які штодзень працуе ў Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы ў Мінску. — На нашым тэатральным фестывалі пабываў дырэктар тэатра „Рампа” Ян Прахыра. Пабачыўшы „Пінскую шляхту” ў выкананні нашых акцёраў, захацеў, каб гэты спектакль паўстаў і ў яго.

Дзеля таго да супрацоўніцтва пры варшаўскай „Пінскай шляхце” запрошаны былі мінскія стваральнікі спектакля: рэжысёр Мікалай Пінігін, мастак-пастаноўшчык Вольга Мацкевіч ды перш за усё акцёр Віктар Манаеў, які дасканала адыграў ролю станавога прыстава Кручкова. Якраз яму прыпалі самыя гарачыя апладысменты пасля спектакля.

Характэрнай рысай спектакля „Пінская шляхта” была і музыка, якую напісаў Андрэй Зубрыч. Аўтарам слоў песень з’яўляецца Уладзімір Някляеў, а іх перакладам на польскую мову заняўся Чэслаў Сэнюх. У выніку паўсталі песні, якія вельмі ўзбагацілі спектакль і дадалі яму яшчэ больш гумару.

— Здаецца мне, што словы гэтых песень выяўляюць сутнасць беларускага характару, — кажа Уладзімір Някляеў. — Так з часоў Дуніна-Марцінкевіча, як і з сённяшняга дня. Характар беларусаў не змяніўся занадта праз гэты час. Супольна з аўтарам музыкі Андрэем Зубрычам мы напісалі, здаецца, цікавую аздобу да таго, што дзеецца на сцэне.

А на сцэне дзеецца шмат. Ёсць і каханне, і гумар, ёсць і амаль трагедыя. Як лічаць польскія акцёры, якія выступаюць у „Пінскай шляхце”, п’еса будзе зразумелая польскай публіцы вельмі добра.

— У Польшчы хіба ніхто ўжо так не іграе, — кажа акцёр Данель Завадзкі. — Такога спектакля ў нас яшчэ не было. А калі ідзе пра змест п’есы, думаю, што гаворыцца тут пра тэмы, якія і ў наш час надалей актуальныя.

На прэм’еры „Пінскай шляхты” ў тэатры „Рампа” прысутнічала шмат запрошаных гасцей. Сярод іх быў згаданы паэт Уладзімір Някляеў, пасол Беларусі ў Польшчы Віктар Гайсёнак. Быў таксама і Зянон Пазьняк.

Прэм’ера спектакля прайшла 30 верасня, а чарговыя пастаноўкі „Пінскай шляхты” будуць паказвацца ў тэатры „Рампа” яшчэ некалькі разоў да канца кастрычніка.

Сустрэча з суродзічамі

Міхась КУПТЭЛЬ

Кожная нагода, каб у гэтым індывідуалізаваным свеце спаткацца з суродзічамі, да таго пры Свяце пячэння бульбы, добрая. Такой нагодай пакарысталіся госці — Галіна Тумаш з Нью-Йорка, дачка Вітаўта Тумаша, і Ліда Рагуля з Вашынгтона, унучка Васіля Рагулі, дачка Міхася Рагулі. Госці з Амерыкі ўпершыню спаткаліся з сям’ёй — Андрэем і Марыяй Сурэвічамі, дзяцьмі роднай сястры Міхала Рагулі (больш змястоўную інфармацыю пра беларускіх дзеячаў можна знайсці ў Вікіпедыі — pl.wikipedia.org/wiki/Witaut_Tumasz і pl.wikipedia.org/wiki/Wasil-Rahula). Амерыканкі адмовіліся ад экскурсіі ў Мальбарк да славутага крыжацкага замка, каб толькі на ўзлонні лясной прыроды ў Сопаце спаткацца з беларусамі з Трыгарада пры пячэнні бульбы.

Зусім я не спадзяваўся, што група беларусаў з пятнаццаці чалавек рознага ўзросту ў вераснёўскі дзень прыемна правядзе час. Спрыяла таму не толькі харошае надвор’е, хоць зранку імжыў дождж. Прыемна прайшоў час сярод сяброў з розных краін свету пры смачнай печанай бульбе з салёным праўдзівым маслам спадара Аляксандра і печанымі каўбаскамі. Пішу пра сяброў з розных краін, бо госці былі не толькі з Амерыкі, але і з Аўстраліі. Адтуль прыехаў Андрэй Сурэвіч, які на пачатку дзевяностых гадоў XX стагоддзя выбыў на антыподы за працай. Гоман дыскусіі і ўспаміны пра мінулае рэхам несліся далёка ў лес. На канец спаткання Люцына Смычынская зрабіла некалькі здымкаў на памяць.

PS. Унучка спадарства Мекіных Ліліяна з маленькай праўнучкай Галенкай дзесьці адлучыліся ад групы. Пэўна малая Галенка заснула, не дачакаўшыся печанай бульбы і таму няма іх на здымку.

Злева направа: Юрка Дварэцкі, Чэслаў Мекін, Марыся Юзафовіч, Аня Мекін, Аляксандр Юзафовіч, Казімеж Смычынскі, Марыя Сурэвіч, Андрэй Сурэвіч, Ліда Рагуля, Галіна Тумаш, Галена Глагоўская, Артур Ніскі і аўтар гэтай карэспандэнцыі

Фота Люцыны СМЫЧЫНСКАЙ

У Беларусі стартавала кампанія па выбарах прэзідэнта. Жаданне ўзначаліць беларускую дзяржаву, альбо, іншымі словамі, стаць галоўным слугой беларускага народа, выявілі 17 асоб. Гэта і было зафіксавана ў адпаведных дзяржаўных паперах. Цяпер прэтэндэнты пайшлі да гэтага самага народа па ягоныя подпісы, каб стаць кандыдатамі на прэзідэнцкую пасаду.

Нягледзячы на тое, што выбары ў Беларусі ўжо доўгі час не прызнаюцца сусветнай супольнасцю за справядлівыя і дэмакратычныя, прэзідэнцкія разам з тым даюць нейкую надзею на змены ў беларускай палітыцы. Таму і стаўленне да іх больш сур’ёзнае з боку палітычных сіл як унутры краіны, так і за яе межамі.

Адсочваць ход кампаніі было б даволі цяжка, калі б у Сеціве не з’яўляліся сайты, якія ствараюцца акурат дзеля асвятлення выбараў. Там збіраецца ўся інфармацыя, якая тычыцца не толькі прыняцця тых ці іншых пастаноў Цэнтральнага выбарчага камітэта, але і дзеянняў прэтэндэнтаў. Адным з такіх сайтаў з’яўляецца **http://election.in-by.net**, які мае назву „Выбары 2010. Агляд прэзідэнцкай кампаніі”.

Адметнасць дадзенага сайта заключаецца ў яго неардынарнасці ў параўнанні з іншымі навіннымі рэсурсамі. Стужка навін месціцца крыху ніжэй за партрэты прэтэндэнтаў, няма нейкіх адмыслова сабраных выйсцяў да іншых рубрык, адразу вядзецца рэйтынгавае галасаванне па „паляўнічых за прэзідэнцкім крэслам”.

Нягледзячы на вартасць сайта, па меншай меры нават з прычыны яго існавання і аператыўнага адсочвання інфармацыі, у ім прысутнічае адна недарэчнасць. Уверсе выяўлення знаходзіцца пераключальнік на рускую/беларускую версіі, але праз яго можна змяніць толькі загалоўкі раздзелаў сайта, а мова тэкстаў застаецца нязменнай.

Таксама застаецца незразумелым справай чыіх добрых рук з’яўляецца дадзены праект. Унізе выяўлення месціцца рубрыка „Кантакты”, але там знайсці штосьці аб аўтарах ці ўладальніках сайта немагчыма — на гэтй старонцы месцяцца толькі адрасы ў Skype, Twitter і электроннай пошце невядомых аглядальнікаў прэзідэнцкай кампаніі, якія да таго яшчэ і прапануюць звязацца з імі, калі ў наведвальніка з’явіцца жаданне пасупрацоўнічаць.

Карысным у будове сайта з’яўляецца яго раздзяленне на навіны аб прэтэндэнтах. Праўда, незразумела, чаму толькі аб шасці з іх, бо нават уверсе размешчаны фотавыявы васьмі.

Прагаласаваць за таго ці іншага прэтэндэнта кожны наведвальнік сайта можа не чакаючы на дзень агульнанацыянальнага галасавання. Для гэтага з правага боку месціцца рэйтынг кандыдатаў. Клікнуўшы на прозвішча аднаго з іх, вы павышаеце яго рэйтынг сярод іншых прэтэндэнтаў. Варта адзначыць, што ўжо адносна працяглы час лідарам застаецца колішні намеснік міністра замежных спраў Беларусі, а цяпер апазіцыянер Андрэй Саннікаў.

Дарэчы, сайт падае таксама інфармацыю аб тых прэтэндэнтах, якія пры набліжэнні выбарчай кампаніі адмовіліся ад жадання стаць прэзідэнтам Беларусі.

Вартымі ўвагі падаюцца таксама спасылкі на іншыя інтэрнэт-рэсурсы, якія месцяцца з правага боку ўнізе выяўлення. Сярод іх не толькі сайты партый ці арганізацый, але і парталы, якіх асвятляюць падзеі ў некаторых гарадах і мясцінах Беларусі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Летапісны верасень

Пры падвядзенні спартовых вынікаў верасня лагічна захапіць і першы дзень кастрычніка, які прыпаў на канец тыдня і прынёс беларускаму баскетболу сапраўдную вядомасць. Жаночая дружына Беларусі ў чвэрцьфінале чэмпіянату свету разграміла аднаго з фаварытаў — зборную Расіі — 70:53. Дагэтуль перамагаць грозных суседак у баскетболе не даводзілася. Каманда Анатоля Буяльскага была блізкая і да паўфінальнай вікторыі ў баталіі з гаспадынямі форуму — чэшкамі, але стала ахвярай неаб’ектыўнага судзейства. У выніку ў змаганні за бронзу забракла фізічных і маральных сіл — канчатковае 4-е месца. Яшчэ на адным чэмпіянаце планеты — па мастацкай гімнастыцы — беларускі таксама былі на вышыні, ужо традыцыйна заняўшы другія пазіцыі ў камандавым турніры і групавых практыкаваннях. А жаночая чацвёрка без рулявой (Ганна Гаўра, Наталля Гелах, Наталля Гаўрыленка і Зінаіда Ключынская) перамагла на чэмпіянаце Еўропы па акадэмічным веславанні.

Мужчынскай камандай месяца назавем зборную па настольным тэнісе, якая стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату кантынента. Дадам, што дзяўчаты ўзялі там бронзу. З клубных калектываў зноў на вышыні быў футбольны барысаўскі БАТЭ, які ўшчэнт зруйнаваў абарону каманды АЗАлкмар з Нідэрландаў — 4:1 і выйшаў у лідары сваёй групы Лігі Еўропы. Гандбольнае мінскае „Дынама” выйшла ў групавы раўнд Лігі чэмпіёнаў. Эфектную серыю вікторый выдала хакейнае мінскае „Дынама” ў чэмпіянаце КХЛ. А мужчынская двойка весляроў з рулявым (Вадзім Лялін, Аляксандр Казубоўскі, Пётр Пятрыніч) выйграла золата еўрапершынства. Верасень стаўся вельмі паспяховым менавіта ў камандавых відах. Далей прадстаўляем індывідуальныя дасягненні.

1. Вікторыя Паўловіч (настольны тэніс) дабілася бліскучага поспеху ў сваёй кар’еры, упершыню выйграўшы золата адзіночнага разраду першынства Еўропы.

2. Меліціна Станюта (мастацкая гімнастыка) заваявала бронзу ў шматбор’і на чэмпіянаце свету, а таксама 3-е месца ў практыкаванні са скакалкай.

3. Настасся Новікава (цяжкая атлетыка) у турэцкай Анталі на фоне допінгавых скандалаў сярод айчынных штангістаў трэці раз запар стала віцэ-чэмпіёнкай планеты (катэгорыя да 58 кг).

4. Аксана Папко (веласпорт) выйграла два залатыя медалі еўрачэмпіянату на трэку ў Пецярбургу — у індывідуальнай гонцы пераследу і ў групавой гонцы па ачках.

4. Кацярына Карстан (акадэмічнае веславанне) у Партугаліі дадала ў сваю калекцыю чарговы тытул — чэмпіёнкі Еўропы

5. Надзея Астапчук (штурханне ядра) на Кубку кантынентаў паказала ў сваім відзе другі вынік, прапусціўшы наперад толькі сталую саперніцу Валеры Вілі з Новай Зеландыі.

1. Цімох Дэйнічэнка (грэка-рымская барацьба) стаў другім на чэмпіянаце свету, што прайшоў у Маскве. У вагавай катэгорыі да 96 кг ён саступіў толькі ў фінале іранскаму атлету.

2. Сяргей Лагун (цяжкая атлетыка) стаў трэцім па суме двухбор’я ў катэгорыі да 85 кг. Гэта другі поспех штангіста на чэмпіянатах свету.

3. Руслан Шэйхаў (вольная барацьба) крыху не дацягнуў да бронзавай узнагароды ў вазе да 96 кг на першынстве свету ў Маскве.

Былі ў верасні і няўдачы. Праваліліся жаночая валейбольная дружына, мужчынская тэнісная, барцы. Упершыню за ўсю гісторыю чэмпіянатаў свету па летнім біятлоне з 1996 г. беларусы не ўзялі аніводнай узнагароды. Гэтыя фіяска забудуцца, а вось дасягненні застануцца ў летапісе.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

„Цаглінкі” спадабаліся і журы, і публіцы

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Стараляўкоўскія „Цаглінкі” славяць нашу малую айчыну і прапагандуюць беларускую культуру па ўсёй краіне, апошнім часам — у Быдгашчы. У гэтым прыгожым і чыстым горадзе з 16 па 19 верасня г.г. адбыўся XIV Агульнапольскі агляд мастацкага руху сеніёраў „АРС-2010”. У мерапрыемстве, сарганізаваным Ваяводскім асяродкам культуры і мастацтва „Старая ахранка” і Агульнапольскім згуртаваннем сеніёра з сядзібай у Быдгашчы, прыняло ўдзел 50 калектываў і салістаў з усяе краіны. З'ехаліся яны ў горад над ракой Брдой, каб паказаць дасягненні мастацкай самадзейнасці клубаў сеніёра і пазмагацца за ўзнагароды ўстаноўленыя Міністэрствам культуры і нацыянальнай спадчыны ды мясцовымі спонсарамі.

Прафесар Венанцыюш Кужава ад імя журы паведамляе, што „Цаглінкі” выступяць на гала-канцэрце

Дзякуючы „Цаглінкам” у запоўненай па берагі глядзельнай зале быдгаскага кінатэатра запанаваў беларускі дух. Пасля конкурсных выступленняў прафесар Венанцыюш Кужава ад імя журы паведаміў, што наш гурт выступіць на гала-канцэрце, а гэта абазначала, што „Цаглінкі” апынуліся ў ліку пераможцаў агляду. Гонар і слава!

Адзначу, што ўсе калектывы выступілі ў прыгожых касцюмах, аднак усе захапляліся нашымі беларускімі строямі. Захапленне публікі выклікалі таксама беларускія песні па-майстэрску выкананыя ляўкоўскімі спевакамі. „Цаглінкі” на сцэне бісавалі тройчы. Стогадоваму спеваку Пятру Юшкевічу публіка стоячы праспявала „Dwieście lat”, а ягоныя сябры з калектыву — „Многае лета”. Падчас працяглых апладысментаў з залы чуліся воклічы „Наш другі Ладыш!”. Арганізатары ўручылі юбіляру вялікі букет чырвоных руж. Узрушаны Пётр Юшкевіч праслязіўся і сказаў па-беларуску: „Дзякую вам сардэчна...”

Ужо перад гала-канцэртам стала вядома, што „Цаглінкі” атрымалі ўзнагароду Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны ў намінацыі „фальклорныя калектывы” (грашавую), а Пётр Юшкевіч удастоіўся спецыяльнай узнагароды куяўска-паморскага ваяводы.

Намі зацікавіліся іншыя калектывы. Яны рабілі з ляўкоўскімі самадзейнікамі супольныя здымкі, абменьваліся адрасамі, куплялі касеты з песнямі „Цаглінак”. Вельмі нас палюбіў калектыў „Устроне” клуба сеніёра з горада Скернявіцы. Члены гэтага калектыву запрасілі нас да сябе ў інтэрнат. Вечарам падаліся мы ў госці. Пры багатым застоллі гучэлі песні абодвух калектываў. Пры развітанні самадзейнікі з калектыву „Устроне” запрасілі „Цаглінак” у Скернявіцы. Запрашэнне было прынята з вялікай удзячнасцю.

У Ляўкова „Цаглінкі” вярнуліся з высока паднятай галавой. Узнагароды і новыя кантакты даюць стымул да далейшай працы, у чым упэўнены музычны кіраўнік калектыву Мікалай Мяжэнны (які з „Цаглінкамі” працуе 17 гадоў) і душа калектыву Галена Барташук.

Малы рух — вялікая справа

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

20 верасня пабываў у Ольштыне віцэ-міністр замежных спраў Польшчы Ян Баркоўскі, які з мясцовымі самаўрадаўцамі абмяркоўваў перспектывы малога памежнага руху. З ліпеня мінулага года Польшча дамоўлена пра такі рух з Украінай. Падобная дамова ёсць з Беларуссю — яна чакае толькі ратыфікацыі. Цяпер польскае МЗС вядзе размовы на гэты конт з Расіяй. Згодна ранейшым пастановам малы памежны рух мае ахопліваць прыгранічную паласу глыбінёй ад трыццаці да пяцідзесяці кіламетраў. Аднак рускія хочуць каб дамова ахоплівала цэлую Калінінградскую акругу, паведаміў віцэ-міністр Баркоўскі. Чакае нас шмат працы, каб Еўракамісія згадзілася на гэтае асаблівае выключэнне, і невядома, калі дамова з Расіяй уступіць у сілу. Сёння візы паспяхова тармозяць кантрабандыстаў, хаця досвед з Украінай паказаў, што кантрабанда не вырасла да такой ступені, якой раней апасаліся і непатрэбныя дадатковыя меры дзеля супрацьдзейнічання ёй.

Самаўрадаўцы, апрача адмоўных, бачаць і станоўчыя аспекты малога памежнага руху. Яны спадзяюцца гаспадарчай актывізацыі, асабліва шляхам турыстычнага абмену. Рускія маглі б прыязджаць да нас за пакупкамі, а мы ездзілі б да іх адпачываць, напрыклад, на пляжы Светлагорска, сказаў адзін з іх. З гэтай мэтай прадбачваецца адкрыццё новых пагранпераходаў Перлы — Крылова і Міхалкова — Жалезнадарожны.

Адгаданка

			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
		12	13	14	15	16
	17	18	19	20	21	22
			23	24	25	26
	27	28	29	30	31	32

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — сербскую прыказку.

1. найяснейшая ў сузор'і Ліры = 12 _ 11 _ 23 _ 29 _;
2. раённы цэнтр між Лідай і Валожынам = 24 _ 5 _ 18 _;
3. частка адзежы, што прылягае да шыі = 1 _ 2 _ 30 _ 25 _ 26 _ 28 _;
4. зло, бяда = 3 _ 4 _ 9 _ 10 _;
5. доля, унесеная ў агульную справу = 17 _ 16 _ 14 _;
6. муж пані = 27 _ 13 _ 15 _;
7. Эдэм = 19 _ 21 _ 22 _;
8. участак зямлі, засаджаны фруктовымі дрэвамі = 6 _ 32 _ 31 _;
9. востраканцовы выступ, напрыклад на сцябле ружы або акацыі = 20 _ 8 _ 7 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 36 нумара

Кварта, нары, плоць, клей, поўнач, Ніксан, спружына, свідар, трапар, шык, вуаль, гляк, ягня, душа, вада, надзея, конь, край, джынсы.

Рашэнне: **Прывід пакойніка часта страшыць нас у выглядзе ягонай удавы.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

10.10 — 16.10

(22.03. — 20.04.) Калі маеш ахвоту грукнуць кулаком у стол, памяркуйся, — шанцы на сямейную гармонію ўзрастуць на 50%. Прадбачваецца шмат рамантычных сустрэч (асабліва з Казярогам і Бараном). Шэф дасць такое заданне, да якога ты яшчэ не зусім гатовы, ды справішся з ім. У фінансах будзь большым рэалістам.

(21.04. — 21.05.) У пачуццях будзь аўтэнтычным, не прытварайся. Памятай: дзякуючы пачуццю гумару ўдаецца развязаць не адну цяжкую праблему. Запаволь тэмп, бо адчуеш стому. Лепш чакаць меншага, каб пасля не расчаравацца. Ды імпрэзуй, бо можаш пазнаёміцца з кімсьці важным.

(22.05. — 22.06.) Перад табою новыя знаёмствы, а затым і новыя магчымасці. Рыхтуюцца шалёныя кампанейскія сустрэчы. Новыя знаёмствы бачацца няблага, ды не гуляй і не прытварайся, калі не хочаш, каб сталі фарсам. У фінансах і на працы будуць лічыцца з тваёй думкай. Ды суровы Сатурн можа напутаць у пачуццях. Не дайся адурманіць новым выклікам і эмоцыям.

(23.06. — 23.07.) Не вяртайся да благіх успамінаў. Цешся тым, што маеш, не чакай пакуль большага. Пастаў кропку над „і”, завяршы старыя справы і смела плануй. Запалу хопіць на шмат тыдняў. Ды з нічым не вырывайся. Са здароўем не пераборшчвай — тады псуецца, калі лішне над ім трасешся.

(24.07. — 23.08.) На працы сустрэнешся з прызнаннем, што можа мець розную форму (ад кампліментаў і хвальбы да павышэння). Праект, у які ты ангажаваўся, пачне прыносіць эфекты. Зрабі баланс здароўя; даследванні можа трэба будзе паўтарыць. Задбай асабліва аб сваю пячонку.

(24.08. — 23.09.) Ніхто цябе не зможа ашукаць і не ўнушыць нічога. Уключыцца твая пранікліваа інтуіцыя. Цешся тым, што маеш, бо гэтага нямала. З 15.10. (да 20.10.) будзеш хораша працаваць і з'яднаеш сабе прыхільнікаў. Еж вітаміны, ды не ў таблетках.

(24.09. — 23.10.) Увесь месяц поўны прафесійных поспехаў. Дазволь сабе на свабодныя і арыгінальныя дзеянні. Калі пойдзеш на стыхійныя дзеянні, ды не страціш галавы, нічога не будзеш шкадаваць. Будзеш вучыцца пакорлівасці і адабрэння таго, на што не маеш уплыву. Можаш закахацца ў асобе, якая не да канца будзе адпавядаць тваім сямейнікам.

(24.10. — 22.11.) Выкажашся рашучасцю, дакладнасцю, самадысцыплінай. Запануй над назойлівымі думкамі, якія не дазваляюць табе і працаваць, і адпачываць. Пад уплывам запальчывага Марса не схочаш чакаць ні хвіліны, ды аналізуй сітуацыю і не запрашай да супрацоўніцтва неадпаведнай асобы ці выбераш рашэнне, якое акажацца некарысным. Вітальныя сілы цябе не пакінуць. І спакой у сэрцы.

(23.11. — 22.12.) Незразумелае стане ясным і простым. Памылак не зробіш, не паставіш фальшывага кроку. Пашырай свае веды, падарожнічай. Калі хочаш спакою ў пары, будзь больш уступчывым. Добры настрой.

(23.12. — 20.01.) За справы бярыся з планам — задавальненне гарантавана. Ад сваіх рашэнняў не адступай. Узрасце твой прэстыж, будуць цябе цаніць і захапляцца табою. Пераканаешся, што з некаторымі асобамі лучыць цябе больш, чым думаў раней.

(21.01. — 19.02.) Чакай ад лёсу мілага сюрпрызу. Хай цябе не карціць папраўляць добрае. Не эксперыментуй, але і не зачыняйся на новыя магчымасці. Не карміся нездаровым.

(20.02. — 21.03.) Чым хутчэй будзеш кіравацца да мэты, тым большыя шанцы, што дойдзеш, да таго ў майстэрскім стылі. Толькі трымай нос на ветры і хутка дзейнічай. Раптоўны зварот у справе, якую ты лічыў ужо замкнутай. Толькі лішне не самазахапляйся, нават калі ўсё пойдзе выдатна. Ды грошай яшчэ пачакаеш.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

ПАДЗІВІЦЦА НА ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

(пачатак у 39 н-ры)

— А многа бацюшкаў налічыў? — пытае Ніна з прыпушчанскай вёскі ў свайго знаёмага.

— Лічыў - лічыў і *шчот* згубіўся!

Яшчэ дваццаць гадоў таму ранг парафіяльнага свята вызначала колькасць свяшчэннікаў. Іх дакладна лічылі і аглядалі, каб пасля за бяседна-сваяцкім сталом удакладніць з якой парафіі, чый ён сваяк, адкуль яго матушка. Гутаркі пра духавенства лічылі тэмай з „вышэйшай полкі", іх звычайна краналі ў пачатку гасціны, калі застольнікі яшчэ не спявалі і не абдымаліся...

Сёння ўсе гаварылі пра аўтобусы і машыны, якія не памесціліся на стаянцы за вёскай. Як не дзіўна, гэтая карціна, з самаходам на першым плане, наклікала думкі пра сілу і патэнцыял людской масы. Як бы сказалі святыя айцы: царква гэта не ўлада і не золата на купалах; царква — гэта народ! У нашым беларуска-падляшскім выпадку неабходна нанесці адну праўку: царква гэта абжыты і працавіты народ. Паломнікі, якія з'ехаліся ў Кудак з усёй Беласточчыны ды нават з замежжа (былі пілігрымы з Беларусі, Грэцыі, Украіны, Францыі), хвалілі жэст праваслаўнага бізнесмена з Варшавы, які сам купіў будынак царквы і выклаў на пабудову ўжо трыста тысяч злотых. Не менш захапляліся і хвалілі працавітасць і ахвярнасць людзей з навакольных вёсак: *Бо яны дзень і ноч дапамагаюць Гаўрыілу!*

* * *

— Каб вы бачылі як з кожнага боку едуць. І старыя, і маладыя! Хлопцы аж ад Ольштына прыехалі, пабралі ў рукі косы і давай траву касіць. Каб даліна не зарасла карчамі, — захапляецца ўголас старэйшая жанчына.

— Нашы пабачаць і яны бягуць, дапамагаюць, — кажа другая старажылка, — а найбольш то дзеткі. Прыбягуць са школы, возьмуць кошык з бульбай і цыбуляй і бягом у *манастыр*. А там Гаўрыіл для ўсіх абед згатуе. Пасля пакліча, пачастуе, добрае слова скажа...

Яшчэ да таго як у белай брызентавай палатцы пачнуць служыць літургію, прыстану на беразе астраўка і разам з іншымі буду глядзець на паломнікаў. Як за старых часоў на *одпусце*, каб сярод мора гасцей адшукаць сваякоў і запрасіць іх у гасціну. У Кудаку глядзелі яшчэ са спадзяваннем чагосьці новага, няўлоўнага:

— Гляджу і не магу надзівіцца на добрых людзей, — кажа Марыя з Бельска. — Яны столькі зрабілі для гэтага куточка на зямлі. Сваімі рукамі. Аж не верыцца...

— А многа ад вас прыехала паломнікаў?

— З Бельска аж два аўтобусы.

Дзесь а палове дзесятай пачнуць з'язджацца паломнікі з Беластока. Восем аўтобусаў!

Іх прыезд ашаломіць і падыме на духу грамаду на беразе. Пачуццё вялікасці падмацуе від пілігрымаў на кладцы, што як рачны прыток будуць спяшаць, каб уліцца ў людскую раку, што выстойвала на беразе Нарвы. Здаецца, сам архімандрыт Гаўрыіл быў уражаны бясконцым патокам пілігрымаў... Ён некалькі разоў выходзіў са свайго доміка-скіта і з усмешкай глядзеў на людзей, якія з набожнымі песнямі на вуснах, пад парасонамі, ішлі падтрымаць справу...

— Я то б дыплом даў для таго арганізатара з Беластока! — кажа дзядзька Аляксей. — Дзе ён столькі народу набраў?!

— А я для таго, што кладку прыдумаў! — перабіла яго жонка Ніна.

Драўляная кладка з дубовых жэрдак не толькі мацуе пачуццё нашай „вялікасці" і сілы. Дзякуючы ёй дарога ў Кудак найпрыгажэйшая на Падляшшы. Асабліва вясной, калі ў паветры крычаць жураўлі, а па падтопленай даліне бродзяць буслы, чаплі, кнігаўкі, кулікі і розныя віды турухтанаў...

* * *

Добра падзівіцца на добрых людзей. Адразу нараджаюцца ідэі, задумы. На беразе астраўка я спачатку падумала пра *глабальную вёску*, а пасля пра *праваслаўную вёску*. Ідзе пра настрой сваяцтва і роднасці, які панаваў сярод паўтаратысячнай грамады паломнікаў у Кудаку. Мелася ўражанне, што ўсе ўсіх ведаюць і любяць! Калі ішоў дождж, незнаёмыя людзі запрашалі да сябе пад парасон, хтось раіў абвінуць шыю шалікам, каб не прастудзіцца. Ад той мегадозы дабрыні і сардэчнасці ў пэўны момант перастаў ісці дождж...

Мяне аднак найбольш уразіла знешняя і духовая перамена беластачанак. У Кудак прыехалі ў хустках на галовах. Гарадская грамада, пазбаўленая ўрбаністычных касцюмаў, напамінала беларуска-праваслаўную вёску. Тут таксама большасць складалі старэйшыя кабеты, удовы або пенсіянеркі. У іх была тая самая заклапочанасць на тварах. Тыя самыя жанчыны, якія ў Беластоку зажэрта размаўляюць на падобнай да польскай мове (і папракаюць тых, хто гаворыць па-свойму словамі: *што ты, дурню, робіш!*), тут гаманілі на сваіх вясковых дыялектах.

Прыкмечаная перамена нашых гараджан у нашых сялян грэла і адначасова палохала. Аказваецца, каб быць сабой, трэба нам збірацца ўжо на дзікіх астраўках, як у час вайны.

— Ідучы па гэтай кладцы ў святое месца, — гаварыў пасля ў час літургіі мітрапаліт Сава, — мы павінны перадумаць сваё месца ў наступаючым XXI стагоддзі. Мы павінны ведаць хто мы і дзе наша месца. Каб не быць прышыванцамі чужой гісторыі.

Прамова кранала балючай тэмы мешаных сужонстваў, якія ў нашым свеце абазначаюць амаль адно: адыход ад праваслаўя!

Словы першаіерарха мацавала глабальня карціна *праваслаўнай вёскі* на астраўку сярод балот і лесу.

рэклама

ISSN 0546-1960